ДЗЕДЗІЧ
Зберагчы і памножыць
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
# ДЗЕДЗІЧ
*Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.*
*(Янка КУПАЛА)*
№ 2 (33)
САКАВІК 2005

2 АДЗІН У ПОЛІ
Як змагацца з дыктатурай
4 ЗАКАХАНЫ Ў РАДЗІМУ
20 гадоў таму памёр Марк Шагал
6 НА ШЛЯХУ ДА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ
25 САКАВІКА – ДЗЕНЬ ВОЛІ
8 ПАНКІ, ГОПНІКІ І ІНШЫЯ ПРАДСТАЎНІКІ СУЧАСНАЙ МОЛАДЗІ

# НЕ ГУБЛЯЦЬ ГОНАР!

## ШАНОЎНЫЯ ВЫКЛАДЧЫКІ!

Усім вядома, што моладзь мае велізарную актыўнасць. Вельмі часта гэта адзіны сродак дамагчыся свайго, калі ўжо здаецца, што трэба спыняць барацьбу. Гэтая якасць дадзена прыродай, і без яе моладзь не здолее існаваць. Без фізічнай актыўнасці чалавек загіне фізічна, без духоўнай – маральна. Таму, калі моладзь свядома паўстае на шлях барацьбы з несправядлівасцю, з яе актыўнасцю прыходзіцца лічыцца ўсім. Нават прэзідэнту, які зараз спрабуе ўзяць студэнцкую моладзь пад свой кантроль. Галоўная задача спадара Лукашэнкі – трымаць студэнцтва на ланцугу, не даваць магчымасці думаць не так, як загадана.

Шчыра кажучы, гэта ў яго не атрымліваецца і не атрымаецца ніколі. Чым больш ён будзе рабіць перашкодаў для свабоднага волевыяўлення, тым больш супраціў ён будзе атрымліваць. Моладзь сёння адкрыта заяўляе, што ёй патрэбна свабода, а не сталінскія рэжымы. І гэтае імкненне не спыніць ні запалохваннямі, ні забаронамі, ні адурачваннем усялякім там БРСМам. Таму што мы не хочам жыць у тыраніі, як зомбі, а хочам жыць у дэмакратычнай краіне.



Фота: ByMedia.net

Колькі нас можна падманваць? Усе хітрыкі прэзідэнта ўжо можна бачыць наскрозь: бясплатны праезд перад выбарамі, усемагчымыя выступленні ў ВНУ са сваімі абяцанкамі-цацанкамі. У той час, як аплата за навучанне расце ледзь не ў геаметрычнай прагрэсіі. А куды ідуць гэтыя грошы?

Чаму студэнты ў Польшчы, Літве, Латвіі жывуць і навучаюцца ў нармальных умовах? Таму што там улады зацікаўлены ў выхаванні інтэлігенцыі, эліты нацыі. А ў нас прэзідэнт імкнецца задушыць у моладзі ўсялякую прагу волі і прымусіць яе пляцаць пад ягоную дудку. І чым далей, тым больш абсурднай становіцца афіцыйная палітыка. А як ужо ўсіх дасталі шматлікія ролікі па тэлебачанні ў выкананні марыянетак-вядучых: Лукашэнка пабудаваў лядовы палац, Лукашэнка перамог інфляцыю, Лукашэнка напісаў кнігу, Лукашэнка правёў дажынкі і г.д. Увесь народ працуе, а вынік – заслуга выключна прэзідэнта. Гэта, акрамя агіднасці, нічога не выклікае.

Мы хочам звярнуцца да нашага кіраўніцтва: выкладчыкаў, дэканаў, прарэктараў, рэктараў і іншых супрацоўнікаў берасцейскіх універсітэтаў. Мы разумеем, што вам трываць гэтую несправядлівасць і хлусню гэтаксама цяжка, як і нам. Мы таксама цудоўна разумеем, што вам даюць загады, якія прымушаюць вас падпарадкоўвацца.

Але ў любой сітуацыі можна заставацца самім сабой і не губляць гонар, а паспрабаваць зразумець пазіцыю студэнтаў. Як нам было агідна, калі мы бачылі сваіх дэканаў, што падчас рэферэндуму мітусіліся па інтэрнаце і заганялі студэнтаў, як тое быдла, на датэрміновае галасаванне. Альбо, калі адчытвалі тых, хто скарыстаўся сваім законным правам не галасаваць. Думаю, брыдка было не толькі нам бачыць гэта, але і вы адчувалі сябе не ў сваёй талерцы, выконваючы гэтыя гнюсныя загады насуперак сваёй волі. Што ў нас застанецца ў памяці пра вас пасля заканчэння універсітэта? Тое, што вы, прыніжаючы сваю і нашу годнасць, спрыялі замацаванню злачыннай дыктатуры?

Мы спадзяемся, што гэтага болей не будзе, і мы разам плённа папрацуем на карысць Бацькаўшчыны. Толькі разам мы здолеем пабудаваць моцную, квітнеючую Беларусь, але для гэтага неабходна зрабіць крок насустрач адзін аднаму. Так што выбар за вамі: альбо вы пляміце сваё сумленне на ўсё жыццё, альбо застаецеся інтэлігентнымі і сумленнымі грамадзянамі.

Прачытаўшы гэты зварот, можа хтосьці з вас скажа: "Лепш бы займаліся вучобай, а не ў палітыку лезлі". Вось мы і хочам вучыцца, каб стаць адукаванымі і разумнымі людзьмі, каб прынесці карысць сваёй краіне. Але мы бачым, што нехта хоча зрабіць з Беларусі зусім іншую краіну. Краіну, дзе пануе страх і роспач, дзе з тэлеэкранаў ільецца абсурд і хлусня, дзе непатрэбны разумныя, адукаваныя і сумленныя грамадзяне, дзе ў пашане – невукі і марыянеткі, якія будуць выконваць любыя загады аж да забойстваў людзей.

І тут ужо не палітыка, а справа ўласнага сумлення: не дапусціць стварэння такой жудаснай краіны. І мы гэтага не дапусцім, бо мы не хочам пражыць усю маладосць пад дыктоўку аднаго чалавека. І мы не з'едзем за мяжу падалей ад «лукашызму», а застанемся тут, каб перамагчы гэтае зло. Бо гэтая краіна – наша. Мы будзем яе будаваць разам, таму што тут жыць нашым дзецям і ўнукам, якія змогуць ганарыцца тым, што яны – беларусы.

Мы пераможам, бо мы – сіла.

**Віталь КОЎШ**

УВАГА!
10 красавіка ў 11-00
у памяшканні БАМГА "Сузор'е"
адбудзецца семінар
**"АСНОВЫ ЖУРНАЛІСТЫКІ"**
Да ўдзелу ў семінары запрашаюцца студэнты, выкладчыкі і вучні старэйшых класаў, якія друкуюць свае артыкулы альбо жадаюць супрацоўнічаць з інфармацыйна-аналітычным бюлетэнем "Дзедзіч".

**Тэмы заняткаў:**
- што такое журналістыка;
- жанры журналістыкі;
- крыніцы інфармацыі і праца з імі;
- як пісаць артыкулы.

Жадаючых прыняць удзел у семінары, а таксама па дадатковую інфармацыю просім звяртацца па тэл.:
(0162) 23-68-02, (029) 725-15-39 (Андрусь).

## АДНЫМ РАДКОМ

### ЗНАЁМСТВА З "РАДАЙ"

Сустрэча прадстаўнікоў моладзевых арганізацый і ініцыятыў Берасцейскай вобласці прайшла 13 сакавіка ў памяшканні "Дзедзіча". Ініцыятарам сустрэчы выступіў Беларускі саюз моладзевых і дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў "Рада".

Мэтай сустрэчы было азнаямленне грамадскіх аб'яднанняў Берасцейшчыны з новай стратэгіяй "Рады" ў адносінах да рэгіянальных арганізацый. Прадстаўнік "Рады" Таццяна Коласава распавяла прысутным пра змены ў стаўленні саюза да дзяржаўных органаў, пра ціск уладаў на арганізацыі, што ўваходзяць у саюз. Так, колькасць арганізацый-сябраў саюза за апошні год скарацілася з 23 да 15. Частку з іх ліквідавалі, частку прымусілі перайсці ў КМА (Камітэт моладзевых арганізацый, утвораны пры БРСМ).

У сувязі з гэтым адбываецца змена місіі "Рады", якая сваёй асноўнай мэтай ставіць на сённяшнім этапе адстойванне канстытуцыйнага права грамадзян на аб'яднанне.

Таксама пашыраюцца кантакты "Рады" з лакальнымі моладзевымі аб'яднаннямі (МА). "Рада" зацікаўлена ва ўсталяванні партнёрскіх стасункаў з мясцовымі арганізацыямі для сумеснага ажыццяўлення адукацыйных праграм, моладзевых абменаў і лабіравання інтарэсаў МА на нацыянальным і еўрапейскім узроўні.

Варта адзначыць, што з больш чым 20 арганізацый, запрошаных "Радай" на сустрэчу, сваіх прадстаўнікоў прыслалі толькі 6. Па словах аднаго з удзельнікаў схода, Старшыні моладзевага грамадскага аб'яднання "Сузор'е" Дзмітрыя Шыманскага, гэты факт можна патлумачыць дзвюма акалічнасцямі: па-першае, за апошнія гады колькасць МА на Берасцейшчыне значна зменшылася, актыўнасць большасці з іх вельмі нізкая. А па-другое, мяркуе Д.Шыманскі, шмат хто не ідзе на супрацоўніцтва з "Радай" з-за яе пазіцыі што да палітычных працэсаў, якія адбываюцца ў краіне ў апошнія гады. У "Раду" ўваходзяць розныя арганізацыі: адны з іх заявілі аб актыўнай падтрымцы дэмакратычнага руху, іншыя – дыстанцыруюцца ад яго, заяўляючы, што моладзь павінна быць па-за палітыкай.

– Сёння ўлады любымі сродкамі імкнуцца зліквідаваць незалежныя моладзевыя арганізацыі, бо яны не ўпісваюцца ў лукашэнкаўскую канцэпцыю дзяржаўнай моладзевай палітыкі, якая прадугледжвае існаванне адзінай, падкантрольнай рэжыму моладзевай структуры – БРСМ. У такіх умовах, на маю думку, для многіх моладзевых лідэраў незразумела пазіцыя "Рады", якая на сённяшні момант ужо прыйшла да ўсведамлення бесперспектыўнасці дыялогу з існуючай уладай, але, на жаль, пакуль не імкнецца да актыўнага ўдзелу ў дэмакратызацыі краіны.

Для таго, каб карыстацца павагай і папулярнасцю сярод беларускай моладзі, "Рада" павінна стаць сапраўдным выразнікам яе інтарэсаў. А моладзь сёння жадае жыць у дэмакратычнай цывілізаванай еўрапейскай краіне – Беларусі, – адзначыў Дзмітрый Шыманскі.

**Dzedzich week-news**

**Шаноўныя сябры!**
**Рэдакцыя "Дзедзіча" з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, які пабачыць свет у сярэдзіне красавіка 2005 г.**
**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 23-68-02 да 15.04.05.**

# ОДИН В ПОЛЕ ВОИН

**ДАВЯТ В БЕЛАРУСИ ГРАЖДАНСКОЕ ОБЩЕСТВО – ОЙ, КАК ДАВЯТ: ЗАГОНЯЮТ В АВТОБУСЫ, ОТПРАВЛЯЮТ НА ХИМИЮ, ЛИШАЮТ СРЕДСТВ К СУЩЕСТВОВАНИЮ, НЕ ВЫПУСКАЮТ ИЗ СТРАНЫ.**

И чтобы до людей информация о репрессиях по отношению к инакомыслящим не докатилась, вместе с сотрудниками негосударственных организаций под горячую руку попадают и журналисты независимых печатных изданий. На улицы выходить теперь просто бессмысленно. Государственная пропагандистская машина сделала свое черное дело – людей, которые принимают участие в уличных митингах, простые белорусы уже давно считают чуть ли не террористами. Вот и приходится всем, кто не согласен с политикой нынешнего режима, сбегать от действительности в виртуальную реальность – Интернет.

Хотя "сбегать" – слово не совсем подходящее. Для многих белорусов всемирная сеть давно уже не в новинку: они и новости в Интернете узнают, и курсы валют, и погоду на завтра, поэтому влияние паутины на умы человеческие у нас в стране повыше будет, чем влияние тех же малотиражных независимых газет, которые власти каленым железом выжигают по всей территории страны. Отсюда следует вывод: Интернет – важный фактор демократизации Беларуси.

Помогать бедной и забитой белорусской демократии через глобальную сеть может каждый. Для этого вовсе не нужно каких-то специальных знаний, умений и навыков, достаточно лишь желания делать нечто конкретное для того, чтобы наша страна не оставалась последней диктатурой Европы ещё ближайшие 30-40 лет.

Для тех, кто со всемирной паутиной находится в весьма натянутых отношениях, я могу дать несколько полезных советов, как один человек с компьютером у себя дома может повлиять на ситуацию в стране больше, чем тысячная толпа на улице с флагами.

Самый легкий способ – завести собственную тематическую ветку на каком-нибудь крупном белорусском форуме, например, на форуме портала TUT.by и информировать общественность о любых важных на ваш взгляд событиях, вовлекать посетителей форума в политические дискуссии. Поверьте, эффект от таких виртуальных разговоров весьма реален.

Однако для того, чтобы "постить" на форумах "неблагонадежные" сообщения необходимо предпринять некоторые меры по сохранению анонимности: не указывать о себе реальной информации в формах регистрации, не оставлять свой адрес электронной почты и использовать прокси-сервера для того, чтобы вас нельзя было отследить по ip-адресу. Например, белорусский прокси-сервер www.byelarus.org/members, который был создан специально для того, чтобы отечественные пользователи всемирной сети могли без особого риска общаться на местных форумах.

А вот для тех, кто не желает зависеть от воли модераторов форума, обладает навыками журналиста и желает самостоятельно реализовывать свой проект в сети, я могу посоветовать американский бесплатный сервис www.blogger.com. Создать свой собственный он-лайн дневник с помощью Blogger – дело пяти минут: достаточно лишь заполнить короткую регистрационную форму, выбрать шаблон дизайна и изменить некоторые настройки "под себя". И ваш собственный информационный Интернет проект готов!

В заключение хотелось бы напомнить начинающим сетевым деятелям об ответственности, которую они несут перед потенциальными читателями. Не надо дезинформировать общественность. Не надо уподобляться государственным СМИ, выдавая желаемое за действительное. Ведь демократия – это не возможность облить грязью оппонента, а право высказать вслух свою аргументированную позицию. В Интернете у нас пока демократия. Остальное – за вами.

**www.3dway.org**

**Ад рэдакцыі:** «Дзедзіч» з вялікай павагай ставіцца да ідэі распаўсюджвання інфармацыі ў інтэрнэце, аб чым больш падрабязна можна прачытаць у рубрыцы «Адным радком» на стар. 4. Але раім не забываць, што карыстальнікамі інтэрнэта з'яўляецца, збольшага, моладзь, якая і так у нашай краіне ёсць правадніком ідэяў дэмакратыі і еўрапейскага шляху развіцця.

А вось на пытанне, як данесці свае ідэі да людзей сталага ўзросту, у нас адказу няма. Мы чакаем ад вас, шаноўныя чытачы, любых меркаванняў на гэты конт і абяцаем надрукаваць усе думкі на старонках «Дзедзіча».

## ЦЫТАТА МЕСЯЦА

**Чаго б Вы хацелі пажадаць прыхільнікам "ДДТ" у Беларусі:**

***– Свабоды... Свабоды. Мы якраз у Менску спявалі такую добрую частушку. У Расеі мы спяваем "Путин едет по стране", а ў Беларусі я заўжды яе спяваю так:***

***Батька едет по стране,
батька всем людям поможет,
дай ему здоровья Боже,
всех бандитов перебьёт,
работягам всем нальёт.
Батька едет по стране,
а мы по-прежнему в г...е.***

**Юры Шаўчук, лідэр гурта "ДДТ".**



**Падчас леташніх мітынгаў ва Украіне Юры Шаўчук быў адным з нешматлікіх расейскіх музыкаў, хто прыехаў у Кіеў і выступіў на Майдане Незалежнасці. Тады Шаўчук сказаў [redacted] не лунаў сапраўдны [redacted]**

*Народ, Беларускі Народ! (М.Багдановіч)*

# ТРЭЦІ ШЛЯХ

**СВЕДЧАННЕМ "ХВОРАЙ" ПАЛІТЫЧНАЙ СІТУАЦЫІ Ў ЛЮБОЙ КРАІНЕ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ТАКОЕ Ж ХВАРАВІТАЕ СТАНОВІШЧА СМІ: ЧЫМ БОЛЬШ НАПРУЖАНАЕ СТАНОВІШЧА З ДЭМАКРАТЫЧНЫМІ ПРАВАМІ Ў ДЗЯРЖАВЕ – ТЫМ МЕНШ НЕЗАЛЕЖНЫХ МЕДЫЯ-СРОДКАЎ, ЯКІЯ НЕ ПАДПАРАДКОЎВАЮЦЦА ІСНУЮЧАМУ РЭЖЫМУ І АБ'ЕКТЫЎНА ВЫКАЗВАЮЦЬ СВАЕ МЕРКАВАННІ.**

На жаль, сітуацыя ў Беларусі складваецца зусім неспрыяльна для незалежных перыядычных выданняў: яны не любяць Усеагульнаабранага, а ён, у сваю чаргу, адказвае ім такой жа, а нават і мацнейшай нелюбоўю. У сувязі з гэтым, выданні, якія сваёй крамолай падштурхоўваюць "бродить умы" здольнай яшчэ лагічна выказваць свае думкі часткі насельніцтва, зачыняюцца з завіднай перыядычнасцю. Але, як бы не лютавала "свяшчэнная інквізіцыя", у XXI стагоддзі засталася прастора, над якой прыслугачы А.Г.Л. могуць панаваць толькі ў марах. Размова ідзе, безумоўна, аб інтэрнэце.




**На фота: кадры з мультфільмаў, размешчаных на сайце «Трэці шлях»**

Бадзяючыся ў пошуках цікавых інтэрнэт-сайтаў, прысвечаных краіне, у якой нам з вамі наканавана жыць, неяк раптоўна рэдакцыя натрапіла на даволі спецыфічны віртуальны праект, прысвечаны грамадска-палітычнаму жыццю Беларусі. Сайт пад назвай "Трэці шлях" (www.3dway.org) зацікавіў, найперш, сваім прызначэннем і падыходам да існуючых праблем. Як заяўляюць аўтары праекту, "сайт скіраваны на аб'яднанне людзей, якія падзяляюць дэмакратычныя погляды... дзеля знаёмства і сумесных дзеянняў, скіраваных на папулярызацыю нашых ідэй і абарону агульных інтарэсаў".




Назву інтэрнэт-старонкі (Трэці шлях) аўтары матывуюць тым, што дабіцца поспеху ў справе рэформы дзяржавы і грамадства можна не толькі аднаўляючы вопыт мінулага (першы шлях) або рэпрадукуючы шлях развіцця іншых дзяржаў (другі шлях), а, разглядаючы розныя аспекты развіцця краін, культуры і грамадства, імкнуцца знайсці свой трэці шлях развіцця беларускай нацыі. Гэта (пошук трэцяга альтэрнатыўнага шляху) і з'яўляецца галоўнай мэтай праекту.

Трэба адзначыць, што сам праект складаецца з некалькіх частак:

ІНФАРМАТАРА (інтэрнэт-газеты),

МУЛЬТ-КЛУБА і ФОРУМА, асноўная прызначэнне якіх – пошук гэтага самага Трэцяга шляху.

Што датычыцца ідэі і часу стварэння інтэрнэтстаронкі, то ў архіве навін мы знайшлі звесткі аб тым, што сайт дзейнічае са жніўня 2004 года і, паводле прызначэння, скіраваны на інфармаванне грамадства і аб'яднанне дэмакратычна настроеных людзей. Аўтары Інфарматара прытрымліваюцца думкі аб тым, што "свабода асобы і незалежнасць кожнага з'яўляюцца асноўнай крыніцай дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў". Таксама арганізатары праекта сцвярджаюць, што "кожны грамадзянін мае права ўдзельнічаць у прыняцці палітычных рашэнняў, што дзяржаўны апарат – гэта слуга грамадства, а не наадварот".

Асобнае месца займае праект пад назвай Мульці-Клуб (mult.3dway.org), які ўяўляе сабой годны адказ прапагандысцкаму молаху дзяржаўных СМІ, якія кругласуткава апяваюць наша жыццё як нейкі апагей дзяржаўна-грамадскага развіцця. Галоўнай, на нашу думку, асаблівасцю гэтага праекту з'яўляецца гумарыстычны падыход да вырашэння няпростай палітычнай сітуацыі, якая склалася на Беларусі.

Назва «Мульці-Клуб» цалкам апраўдвае сябе шэрагам "флэшак", якія раскрываюць сутнасць палітычных падзей, што адбываюцца на Беларусі. Галоўным героем, як можна здагадацца, з'яўляецца А.Г.Л. і ягоная світа: Ярмошына, Ціцянкоў і шэраг іншых. Флэшкі выкананы якасна і агучаны арыгінальным сіплым голасам, а таму час, які зойме ў вас капіраванне файлаў з інтэрнэта, цалкам апраўдае сябе. Мы ўпэўнены, што нашы родныя флэшкі, прысвечаныя айчыннаму куміру – Бацяні, не саступяць па папулярнасці аналагічнаму расейскаму персанажу – Масяні ды іншым віртуальным героям.

**Замест пасляслоўя (узята з Інфарматара):**

«Вырвавшийся из моей души вопрос: Вот так и живем. Власть своей жизнью, белорусский народ – своей. Власть делает вид, что страна процветает. Народ делает вид, что ей верит».

**Андрусь УРУБЛЕЎСКІ**




## АДНЫМ РАДКОМ

### ШТО ТАКОЕ КАНСЕРВАТЫЗМ

Адукацыйны семінар "Кансерватыўная ідэя" прайшоў у "Дзедзічы" 12 сакавіка. Семінар меў на мэце ў цікавай інтэрактыўнай форме пазнаёміць берасцейскую моладзь з асновамі найбуйнейшых палітычных ідэалогій свету.

Удзел у ім узялі больш за 20 студэнтаў берасцейскіх ВНУ, якія цікавяцца палітычнымі працэсамі ў Беларусі і ў свеце.

Трэнеры-выкладчыкі не толькі перадавалі слухачам тэарэтычныя веды з палітычных дысцыплін, але і далі магчымасць акунуцца ў атмасферу палітычнага жыцця дэмакратычнай краіны. Ролевая гульня ў выбары дэпутатаў гарсавета, якія пазней вядуць перамовы і ўтвараюць кааліцыі з мэтай размеркавання пасадаў у выканаўчай уладзе, паказала ўдзельнікам, наколькі важным бывае ўменне дасягаць кампрамісаў і ісці на саступкі для дасягнення галоўнай мэты.

Арганізатарам семінара выступіла моладзевая камісія Партыі БНФ. Перад удзельнікамі выступіў старшыня Берасцейскай абласной арганізацыі Партыі БНФ Юрась Губарэвіч, які адзначыў, што напярэдадні палітычнай кампаніі 2006г. (якая для дэмсілаў ужо пачалася) істотным з'яўляецца не толькі колькасны рост актывістаў дэмакратычнага руху, але і павышэнне іх прафесійных навыкаў у палітычнай барацьбе, на што Партыя БНФ зараз скіроўвае значную ўвагу.

Дзмітрый Шымански, старшыня Рады БАМГА "Сузор'е", у заключным выступе выказаў спадзяванне, што калі дэмакратычныя сілы здолеюць эфектыўна арганізаваць і правесці выбарчую кампанію 2006г. (што залежыць у тым ліку і ад удзельнікаў гэтага семінару), то шмат у каго з актывістаў гэтай кампаніі будзе шанец паспрабаваць свае сілы ў барацьбе за дэпутацкія мандаты падчас мясцовых выбараў у 2007г. Д. Шымански заклікаў моладзь пачынаць ужо зараз фармаваць свае выбарчыя штабы, далучаючы да палітычнай дзейнасці сваіх знаёмых.

Трэнеры, сярод якіх быў намеснік старшыні Партыі БНФ Аляксей Янукевіч, засталіся задаволеныя актыўнасцю берасцейскай моладзі. А па словах аднаго з удзельнікаў семінара, студэнта 4 курса БрДУ В.Каўша, у студэнтаў, узброеных новымі ведамі, будзе аб чым паразмаўляць з выкладчыкамі на лекцыях па асновах дзяржаўнай ідэалогіі.

**Dzedzich week-news**

### ЯК СТВАРЫЦЬ СМІ

У канцы лютага ў Любліне адкрыўся Еўрапейскі медыяцэнтр. Яго заснавальнікамі сталі Фундацыя "Nowy Staw" і Таварыства "Люблінскі асяродак самапомачы". Партнёрамі гэтага праекта выступілі арганізацыі з Нямеччыны, Нарвегіі, Галандыі ды Швецыі.

Гэта першая ініцыятыва такога кшталту ў Польшчы. Праект ёсць часткаю праграмы "Leonardo da Vinci", якая датычыць удасканалення адукацыі і пашырэння сумеснай працы краін Еўразвяза ў галіне прафесійнай адукацыі. Цэнтр мае на мэце падтрымку польскіх мясцовых СМІ, што ўтвараюцца звычайнымі людзьмі, якія такім чынам змогуць выявіць сябе, рэалізаваць свае ідэі з выкарыстаннем прафесійнай мультымедыйнай тэхнікі.

– Людзі павінны мець магчымасць не толькі аглядаць сродкі масавай інфармацыі, але і прымаць удзел у іх стварэнні – адзначыў адзін з кіраўнікоў Цэнтра Міхал Войцік.

**Dzedzich week-news**

## АДНЫМ РАДКОМ

### “ПАДПІШЫ СЯБРОЎ!”

«Дзедзіч» абвяшчае акцыю па падпісцы берасцейскай моладзі на папулярную электронную рассылку Dzedzich week-news.

– Быць у курсе ўсіх падзей, што адбываюцца ў моладзевым асяроддзі Берасцейшчыны,

– атрымаць магчымасць паўдзельнічаць у цікавых адукацыйных праграмах, моладзевых абменах з еўрапейскімі краінамі,

– далучыцца да дзейнасці незалежных моладзевых арганізацый,

– трымаць руку на пульсе падзей падчас прэзідэнцкіх выбараў 2006г.,

– стаць удзельнікам “памаранчавай рэвалюцыі па-беларуску” – такія магчымасці дае падпіска на рассылку Dzedzich week-news.

Той, хто падпіша на рассылку 3 сяброў, атрымае фірмовы каляндарык "Дзедзіча", хто падпіша 5 сяброў – ручку з фірмовым лагатыпам, а калі пастарацца і падпісаць 10 чалавек – прызам будзе CD з любой беларускай музыкай альбо відэафільмам на выбар.

Падпісаць сяброў можна самастойна на сайце **www.dzedzich.org**, альбо даслаць іх e-mail на адрас **dzedzich@dzedzich.org**. Калі вы падпісваеце сябра самастойна, не забудзьце даслаць нам ліст з пазначэннем падпісаных вамі адрасаў і вашага кантактнага тэлефона.

**Dzedzich week-news**

### БЕЛАРУСКІ WINDOWS

Компания "Microsoft" собирается включить белорусский язык в стандартный набор языков, которые поддерживаются в текстовом редакторе "MS Word".

По словам заместителя председателя общественного объединения "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" (ТБМ) Сергея Крючкова, с предложением включить белорусский язык в стандартный языковой набор ТБМ обращалось к компании "Microsoft" не один раз, но прежде им заявляли, что это нецелесообразно, однако на этот раз дали положительный ответ.

По словам Крючкова, разработанная совместно с представителями ТБМ программа проверки орфографии белорусского языка "Літара 1.0" является крупнейшим в мире электронным словарем белорусского языка. Его уникальность состоит еще и в том, что он предусматривает как официальную, так и классическую традиции правописания. В словарь включено более двух миллионов словоформ для каждого варианта правописания, причем программа выполняет автоматическую конвертацию текстов с официального правописания в классическое и наоборот.

– Решение "Microsoft" для нашего языка чрезвычайно важное, — считает один из научных консультантов проекта, председатель Партии БНФ Винцук Вячорка. — Оно означает, что белорусский язык, как нормальный и самодостаточный, будет обслуживаться основными текстовыми редакторами. Отныне технические проблемы не мешают употреблению белорусского языка во всех сферах жизни.

В то же время В.Вячорка выразил сожаление по поводу того, что нынешняя белорусская власть ничего не сделала для решения этой проблемы:

– Все соседние страны финансируют такие проекты и лоббируют их на международной арене, потому что развитый национальный язык — один из фундаментов суверенитета и международного авторитета страны.

**БелаПАН**

## вяртання маўклівая споведзь

# ЗАКАХАНЫ Ў РАДЗІМУ



***"Ні царскай, ні савецкай Расеі я не патрэбны. Мяне не разумеюць, я тут чужы"***
**(з кнігі Марка Шагала "Маё жыццё")**

**20 ГАДОЎ ТАМУ, 28 САКАВІКА 1985Г., ПАКІНУЎ ГЭТЫ СВЕТ МАРК ШАГАЛ, ЗНАКАМІТЫ БЕЛАРУСКІ МАСТАК-ЖЫВАПІСЕЦ, МАНУМЕНТАЛІСТ, ГРАФІК, ІЛЮСТРАТАР, ЯКІ ДОЎГІ ЧАС ЛІЧЫЎСЯ Ў СССР "ЗАБАРОНЕНЫМ".**

Ён належыць да плеяды бясстрашных шукальнікаў, якія адкрылі сваёй творчасцю ў першыя дзесяцігоддзі XX ст. новую эру ў мастацкай культуры чалавецтва. Восем дзесяцігоддзяў Шагал тварыў свой Сусвет, дзе мудрагеліста спляліся біблейскія легенды, персанажы казак і героі быту, убачаныя мастаком у новым вымярэнні.

Марк Шагал нарадзіўся 6 ліпеня 1887г. у Віцебску ў шматдзетнай габрэйскай сям'і гандляра селядцамі. Атрымаўшы пачатковую адукацыю ў хедэры, хлопчык паступіў у гарадское чатырохкласнае вучылішча, якое пакінуў у 17 год.

Тады ў ім прачнулася цікавасць да жывапісу. Юнака прымае ў сваю студыю знакаміты віцебскі мастак Юдэль (Юры) Пэн. Толькі два месяцы наведвае Шагал гэтую студыю, сумленна замалёўваючы гіпсавыя галовы і арнаменты, але гэтага часу аказалася дастаткова для таго, каб маэстра Пэн палюбіў свайго вучня. Былі і іншыя школы і настаўнікі: Н. Рэрых, Л. Бакст, але Шагал да апошніх дзён жыцця абагаўляў свайго першага настаўніка. Адным з першых заўважыў, адзначыў і стаў заступнікам маладога мастака вядомы расейскі юрыст і грамадскі дзеяч Максім Вінавер. Менавіта ён восенню 1910г. прадаставіў Шагалу стыпендыю ў памеры 125 франкаў у месяц для працягу вучобы ў Францыі. Шагал пасяліўся ў Парыжы, і ўжо ў траўні 1914г. у Берліне адбылася персанальная выстава мастака.



**М.Шагал «Закаханыя над горадам»**

Праз месяц Марк Шагал вярнуўся ў Пецярбург, каб ажаніцца з Бертай Розенфельд, якую з юнацкай жарсцю кахаў усе 29 гадоў іх сумеснага жыцця. М. Шагал не змог з-за распачатай хутка І Сусветнай вайны зноў з'ехаць у Парыж. Кастрычніцкія падзеі 1917г. заспелі М. Шагала ў Петраградзе.

Прыняўшы бальшавіцкі пераварот з энтузіязмам, пазней Шагал расчараваўся ў камуністычнай ідэі. Яго кандыдатуру прапаноўваюць у міністэрства мастацтва. Ды Шагал аддаў перавагу роднаму гораду, дзе мастак з'явіўся ў верасні 1918г. з мандатам упаўнаважанага па справах мастацтваў Віцебскай губерні. Галоўнай мэтай, якую паставіў перад сабой М. Шагал, была арганізацыя Мастацкага вучылішча.

У 1920г. Марк Шагал з сям'ёй паехаў у Маскву, нават не падазраючы, што назаўсёды расстаецца са сваім любімым горадам. Па волі выпадка назаўсёды застаўшыся за мяжой, Шагал 15 гадоў не прымаў французскага грамадзянства, спадзеючыся калі-небудзь вярнуцца на радзіму.

У 1941г., цудам вырваўшыся з рук фашыстаў у акупаванай імі частцы Францыі, ён апынуўся ў ЗША. Даведаўшыся пра лёс роднага горада, які за гады фашысцкай акупацыі быў ушчэнт разбураны і згубіў амаль усё насельніцтва, Шагал напісаў "Ліст майму роднаму Віцебску", які быў апублікаваны ў адной з амерыканскіх габрэйскіх газет.

Віцебскія вуліцы і плошчы, помнікі архітэктуры адлюстраваны на многіх карцінах Марка Шагала. Выступаючы на адкрыцці выставы ў Траццякоўскай галерэі летам 1973г., ён сказаў: "У мяне няма ніводнай карціны, на якой вы б не пабачылі фрагменты маёй Пакроўскай вуліцы. Гэта, можа быць, і недахоп, але не з майго пункту гледжання".

З Віцебскам звязана толькі чвэрць жыцця мастака. Але менавіта яна адыграла вырашальную ролю ў яго станаўленні, дала багатыя, незабыўныя ўражанні, натхненне на ўсё астатняе жыццё. Родны Віцебск стаў той крыніцай, з якой Марк Шагал чэрпаў сюжэты для прац.

У 1948г. Шагал вярнуўся ў Францыю. Там ён здабыў сабе імя мастака "сусветнай спагадлівасці". Дастаткова толькі прыгадаць такія яго манументальныя працы, як роспісы плафона Гранд-Апера ў Парыжы, афармленне 12-ці вітражоў сінагогі на захадзе Ерусліма. І карціны: "Дом на Пескаваціках", "Вуліца", "Дом на вуліцы Пакроўскай", "Віцебск. Чыгуначная станцыя" і інш.

Шагала трэба ўбачыць. Убачыць "кантрасты" яго непаўторнага мастацтва, дзе змешваюцца фантазія і рэальнасць, мара, гратэск, асабістая і народная памяць, нацыянальнае і рытуальнае мысленне, элементы фальклору і неверагодная шчырасць. Яго прынята называць "мастаком-паэтам", а яго мастацтва – "звышрэальным". У шагалаўскім свеце ўжываюцца фальклорныя персанажы, дзіўныя каровы, аслы, музыкі, гандляры і закаханыя, што лунаюць над горадам. Горад, над якім яны ўзлятаюць, – Віцебск. Яго мастак не пераставаў шукаць нават на берагах Сены.

За свой доўгі век (пражыў 98 гадоў) Марк Шагал шмат чаго спазнаў: няўдачы і поспех, напаўгалоднае існаванне і матэрыяльны дабрабыт, раўнадушша і сусветную славу. Толькі аднаго ён быў поўнасцю пазбаўлены пры жыцці – прызнання на радзіме. На жаль, Марк Шагал не адзіны, чыім лёсам сталася гэтае пакутлівае выпрабаванне.

**Алена ДЗЕМІДЗЮК**

# ДЕФЕКТЫ ЦВЕТНОГО ЗРЕНИЯ

**МОЯ УЧИТЕЛЬНИЦА РУССКОГО ЛЮБИТ ПОВТОРЯТЬ, ЧТО ЧАСТО АВТОР ВЫСКАЗЫВАЕТ НЕКУЮ ТОЧКУ ЗРЕНИЯ, СОВСЕМ НЕ РАЗДЕЛЯЯ ЕЕ.**

Во-первых, он подтрунивает, даже издевается над наивным читателем, во-вторых, это сильное противоречие между двумя мнениями одного человека позволяет избежать того, что она называет "дефектом цветного зрения". И я согласен с этим. Я тоже иногда говорю, что…

**… наверное, я не люблю нынешнюю власть.** Вполне возможно, что я ее ненавижу. Хотя вряд ли. Ненависть подразумевает хоть капельку вовлечения. Остановимся на том, что я ее презираю. Иногда, когда я оказываюсь в "сочувствующей" компании, приходится вести подрывную деятельность. Скажем, говорю присутствующим:

– Не знаю как вы, а я знаю по меньшей мере два чиновника, которые живут не по средствам. Один из них, зам. председателя N-го комитета, берет взятки, а его начальник, председатель комитета, не берет. Тогда начальник начинает испытывает сильнейший нравственный дискомфорт: он обедает в "Макдональдсе", а подчиненный в "Планете суши"; ездит на "Фольксвагене", а подчиненный на "Геландевагене"... В самом деле: почему честный человек живет гораздо хуже негодяя? Если наша предпосылка верна, то заместитель должен вскоре оказаться в тюрьме. Но этого не происходит. Следовательно, наша предпосылка неверна и у обоих, что называется, рыльце в пушку.

На лицах слушателей появляется тень сомнения. Но я не унимаюсь:

– Таким образом, если хоть один самый мелкий чиновник берет не по чину и при этом в открытую сибаритствует, то, продолжая нашу логическую цепочку, можно сказать, что вся система власти насквозь коррумпирована.

При словах "вся" и "насквозь" на их лицах проскальзывает легкая конвульсия. Их теории «доброго царя» нанесен удар.

Еще я не люблю нашу церковь. И мой разум отказывается понимать ту сложнейшую метафизическую теорию, позволяющую церкви получать солидную долю от пошлин на сигареты. Когда я вижу попов с лоснящейся кожей и волосами, у меня возникает сильное желание бросить курить. Просто назло.

Зато я люблю Оруэлла. Так и представляю себе: сидит он в своем поместье с вересковой трубкой перед камином, а далеко на востоке восстанавливают после войны народное хозяйство. И вот сидит Оруэлл, попыхивая трубкой, сидит и ненавидит и это народное хозяйство, и Политбюро, и весь Советский Союз заодно. И в это самое время в его джентльменском мозгу мелькает любимый афоризм моей дорогой учительницы: "Абсолютно белое, как и абсолютно черное, кажется каким-то дефектом зрения". Противоречие ведь, правда? Развиваем мысль дальше.

Скажем, иду сегодня по улице, а навстречу мне отряд БРСМовцев. У них скидки на дискотеки и парикмахерские, а у меня – нет. Потому они все причесанные и с романтической идиотинкой во взгляде, а я лохматый, как пес и идиотинка какая-то совсем скучная. Вот мы поравнялись, и они, все в красных галстуках, говорят мне:

– Ну что, четвертая власть, продаемся не задаром, размениваемся не по мелочам?

А я им:

– Да нормально. – И все, никакого словца красного.

И идут дальше. Только один мне вдогонку подудел из своего горна, да и спрятал его обратно в шорты.

А я иду и ненавижу их. А сейчас думаю: может, это и есть герои нашего времени? А еще попозже думаю: точно они, кто ж еще. И для этого есть по крайней мере три причины. Скажем…

**… Нонконформизм.**

Удивительная вещь. Вы найдете сторонника режима лишь с величайшим трудом. Бытует версия, что эти пресловутые 79% электората имеют глубоко эшелонированную конспирацию. Делается это для того, чтобы американцы не обладали точными сведениями о гражданах, готовых воевать против США. Поэтому каждый неофит режима должен обладать гигантским запасом нравственных сил для противостояния мнению толпы. Причина этого не только в юношеском бунтарстве или попытке интеллектуальной элиты выделиться из глупого проамериканского большинства. Нет. Тут мы имеем дело с самой что ни на есть христианской правдой, с верой в то, что есть иной путь, помимо того, что рождается в промытых кока-колой мозгах большинства недовольных.

**… Творческое воображение.**

Не нужно относится слишком строго к нашей пропаганде. Что можно требовать от учения, главной задачей которого является убедить большинство в том, что видимое всеми серое ближе к ослепительно-белому, чем воображаемое черное? Но у глупости нашей идеологии есть другая цель: она выступает в роли своеобразной бритвы Оккама, инструмента, отрезающего все неискреннее и привлекающее в ряды власти только тех людей, которые обладают самым ясным взором. Глянет такой человек на бабушек, собирающих бутылки, подмигнет им хитрым глазом, вспомнит то, что сказал ему политрук и подумает: "Эта бабушка взяла кредит для покупки жилья на проспекте Машерова. А денег на очередной взнос не хватает, самую малость, конечно. Вот и подрабатывает". Или глянет на юношей в грязной, ободранной одежде, несущих с собой клей в пакете, и такая мысль у него: "А это переодетые студентики из Института русского языка, изучают уличную словесность. Наслышаны. А сейчас, видно, спешат в кружок авиамоделирования".

**... Мораль нового мира.**

В отличие от всяких там баптистов и адвентистов, БРСМовцы начинают помогать старикам и инвалидам только перед выборами, при этом активно афишируя свои старания. Это кажется верхом цинизма лишь на первый взгляд. На самом деле мы видим первые ростки новой морали, морали крайнего индивидуализма, морали людей, для которых нет черного, белого или, не дай Бог, красного. Есть только зеленый. И по сравнению с этим протестантский индивидуализм кажется стадным коллективизмом. Ходят слухи, что устав БРСМ вскорости будет заменен двумя максимами:

– Своя рубашка ближе к телу.

– Лучше стучать, чем перестукиваться.

Именно эта мораль, мораль нового человека, поможет нам догнать и перегнать иудо-христианский мир.

**Итого…**

Вечером наш герой стоит у окна, глядит на вечерние огни и напряженно думает, зачем-то неловкими стихами:

Да, мы мало кому понятны и многие
смеются над нами.
Но мы мирное племя и даже война нам
не очень нужна.
Оставьте Блэрам "Ролс-Ройсы",
а Берлускони их "Мазератти".
Мы построим свой дивный мир.
Аминь.

**www.3dway.org**


## ПРИГЛАШАЕМ ВОЛОНТЁРОВ

### ДЛЯ ПОДДЕРЖКИ ЕДИНОГО КАНДИДАТА ОТ ДЕМОКРАТИЧЕСКИХ СИЛ НА ПРЕЗИДЕНТСКИХ ВЫБОРАХ 2006г.

**– Вас не устраивает ситуация в стране, но вы верите, что её можно изменить;**
**– Вы устали верить обещаниям Лукашенко и поддерживаете демократическую оппозицию;**
**– Вы желаете внести свой вклад в возрождение независимой и процветающей Беларуси;**
**– Вам больше 18 лет, и вы можете посвятить часть своего времени избирательной кампании;**
**– Вы хотите приобрести навыки общения с людьми, умения убеждать, взглянуть на выборы изнутри: не как простой избиратель, а как активный участник событий –**

## НАМ НУЖНА ВАША ПОМОЩЬ!

**МЫ ОБЕЩАЕМ:**
**– проведение для вас образовательных семинаров, стажировок как в г. Бресте, так и в других городах и странах;**
**– обеспечение вас всеми необходимыми навыками ведения эффективной агитации;**
**– предоставление возможности продолжить свою политическую карьеру при нашей поддержке;**
**– создание дружеской атмосферы и знакомство с интересными людьми.**

**ЧТО МОЖНО ДЕЛАТЬ: сбор подписей, распространение листовок, расклейка плакатов, агитация, участие в создании предвыборной программы, наблюдение за выборами.**

**ЗВОНИТЕ НАМ В ЛЮБОЕ ВРЕМЯ ПО ТЕЛ:**
**23-68-02, (029) 660-57-41, (029) 725-15-39, 41-12-00.**

**Брестская городская организация Партии БНФ**

## ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

### 15 САКАВІКА

15 сакавіка 1994г. была прынятая **Канстытуцыя РБ.** Першая канстытуцыя незалежнай Беларусі. Менавіта тая канстытуцыя ўводзіла ў краіне пасаду прэзідэнта, але не давала ніякіх гарантый ад аўтарытарнай мадэлі ўлады. Памылка выявілася неўзабаве. Прыйшоўшы да ўлады ў тым самым 1994 годзе, А.Лукашэнка ператварыў прававую дзяржаву ў адзін вялікі саўгас і сканцэнтраваў усю ўладу ў сваіх руках, змяніўшы пад свой густ усё, у тым ліку і канстытуцыю.

### 22 САКАВІКА



22 сакавіка 1864г. у Вільні на Лукішскім пляцы мураўёўцы павесілі **Кастуся Каліноўскага.** Цяпер на месцы гібелі змагара ёсць мемарыяльная табліца. Але дакладнае месца пахавання Каліноўскага невядомае. ¨сць звесткі, што магіла яго – недзе ў замкавай Гедымінавай гары. Нібыта яшчэ ў міжваенны час удзячныя нашчадкі паставілі на тым месцы крыж. Але цяпер ад таго крыжа не засталося ані знаку.



22 сакавіка 1943г. гітлераўцы спалілі беларускую вёску **Хатынь** разам з людзьмі. А была гэта невялікая вёска, 26 двароў. Учыніў экзэкуцыю карны атрад эсэсаўцаў обэрштурмбанфюрэра Аскара Дзерлівангера. У агні згарэлі 149 хатынцаў, у тым ліку 75 дзяцей. Сёння на месцы спаленай вёскі збудаваны мемарыял.

Хатынь – адна з многіх спаленых у вайну беларускіх вёсак. ¨сць меркаванне, што менавіта яна абраная за сімвал, бо яе назва сугучная з назваю Катыні на Смаленшчыне, дзе савецкія карнікі знішчылі тысячы польскіх афіцэраў. І зроблена гэта было, каб заблытаць звесткі – хто, дзе, калі і каго забіваў – і такім чынам зацерці праўду пра трагедыю Катыні. Трэба мець на ўвазе, што і за афіцыйнай легендай хатынскай трагедыі застаецца шмат няяснага. Гадоў пятнаццаць таму, калі паадкрываліся архівы, у друк патрапілі звесткі пра тое, што хатынцаў спалілі не немцы, а карны ўкраінскі батальён. Быццам бы напярэдадні здарэння савецкія партызаны на дарозе каля Хатыні забілі нямецкага афіцэра, любімчыка Гітлера. Вось жа спаленне вёскі фашыстамі было наўпрост справакаванае так званымі народнымі мсціўцамі...

Так ці інакш, а поўная праўда пра хатынскую трагедыю яшчэ не распаведзеная. Бясспрэчным застаецца і застанецца толькі факт злачынстваў, якім не будзе тэрміну даўнасці.

# НА ШЛЯХУ ДА

**СЁННЯ МАЛА ЯКІ ІНТЭЛІГЕНТНЫ БЕЛАРУС (ЯКІМ БЕЗ СУМНЕВУ ЁСЦЬ ЧЫТАЧ "ДЗЕДЗІЧА") НЕ ВЕДАЕ ДАТЫ 25 САКАВІКА. АБВЯШЧЭННЕ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ. ГЭТА ГУЧЫЦЬ, БЫ ФАНФАРЫ. 25 САКАВІКА 1918г. Ў МЕНСКУ, ПАСЛЯ ДВАНАЦЦАЦІГАДЗІННАГА ПАСЯДЖЭННЯ РАДА БНР ПРЫНЯЛА ТРЭЦЮЮ УСТАЎНУЮ ГРАМАТУ, У ЯКОЙ АБВЯСЦІЛА БЕЛАРУСЬ НЕЗАЛЕЖНАЙ І ВОЛЬНАЮ ДЗЯРЖАВАЙ. ДЫ ДАРОГА ДА ГЭТАЙ ПАДЗЕІ БЫЛА ДОЎГАЯ І НЯЛЁГКАЯ.**

18 снежня 1917г. у Менску быў разагнаны Усебеларускі з'езд, які меў мэтай сваёй дзейнасці вызначэнне далейшай долі Беларусі. Дазвол на правядзенне яго даў урад Леніна, а наркам па справах нацыянальнасцяў Восіп Сталін выдзеліў на патрэбы з'езду 50 тысяч рублёў, абяцаўшы, што рашэнні Усебеларускага з'езда будуць прызнаныя Савецкай уладай. Такім чынам, з'езд меў законны статус (прыпомнім, што да студзеня 1918г. Савет народных камісараў Леніна лічыўся часовым урадам Расеі, ягоную законнасць яшчэ ніхто сур'ёзна не аспрэчваў, а грамадзянская вайна пачнецца па разагнанні бальшавікамі Усерасейскага Устаноўчага сходу).

На Усебеларускі з'езд прыехалі 1872 дэлегаты з усіх беларускіх губэрняў (Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Менскай, Гарадзенскай і Смаленскай). Такога прадстаўніцтва не збіраў ніводны народ Расіі. Бальшыня партыйных дэлегатаў належала да сацыялістычных плыняў, а ўвогуле гэты з'езд можна было назваць сялянскім, бо земляробы на ім пераважалі. На чале з'езда стаяў, як ганаровы старшыня, акадэмік Яўхім Карскі.

Паслоў на з'езд найбольш займалі 2 пытанні: пытанне вайны і міру і пытанне ўлады. Дэлегацыя бальшавіцкага ўрада на чале з Троцкім вяла перамовы з Нямеччынай у Берасці. Ці не трэба туды сваіх прадстаўнікоў? Быў зроблены запыт, на які Леў Троцкі адказаў: доля Беларусі не будзе рашацца без уліку волі беларускага народа.

Ужо ў першы дзень працы з'езда чуліся заклікі абвясціць Беларускую Народную Рэспубліку, ды ў асяроддзі дэлегатаў былі моцныя аўтанамісцкія настроі. Аднак, нягледзячы на гэта, бальшавіцкае кіраўніцтва Заходняй вобласці было настроена да з'езда варожа: старшыня выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту Мяснікоў (Мяснікян) даў указанне сваім аднадумцам сярод дэлегатаў: "Сообщите товарищам, чтобы на съезде белорусов они произвели переворот умов, раскол... Это требуется". Раскалоць з'езд не ўдалося, мабыць, праз малы лік выбраных бальшавікоў.

У ноч з 17 на 18 снежня ўдзельнікі з'езда пачалі складаць рэзалюцыю. З'езд пастанавіў: усталяваць на нашай зямлі рэспубліканскі лад, лічыць Беларусь часткай Расеі. Дэлегаты пастанавілі абраць са свайго складу Усебеларускі Савет сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў.

Акурат у той момант, калі быў прыняты першы пункт рэзалюцыі, у залу ўвайшлі прадстаўнікі наркома ўнутраных спраў Алібегава, а дом Шляхетнага сходу, дзе адбывалася пасяджэнне, быў акружаны салдатамі з двума браневікамі. Разагнаць Усебеларускі з'езд загадаў Мяснікоў, – аддаваць уладу бальшавікі не хацелі нават сацыялістам.



**Менскі гарадскі тэатр (цяпер Нацыянальны тэатр ім. Я.Купалы), дзе распачаў свае пасяджэнні Першы Усебеларускі кангрэс.**

У тую ж ноч былі арыштаваны многія відныя ўдзельнікі Усебеларускага з'езда. Але дэлегаты не дэмаралізаваліся. Пад аховай менскіх чыгуначнікаў яны, законныя прадстаўнікі беларускага народа, сабраліся ў лакаматыўным дэпо і абралі Раду Усебеларускага з'езда. 21 снежня Рада абрала выканаўчы камітэт на чале з Язэпам Варонкам (БСГ). Калі 19 лютага 1918г. бальшавікі пакінулі Менск, выканкам Рады выйшаў з падполля і сфармаваў 20 лютага беларускі ўрад – Народны сакратарыят. У першай Устаўной грамаце, выданай 21 лютага, выканкам Рады абвясціў сябе часовай уладай у Беларусі. Але Беларусь не была тады абвешчана дзяржавай. Увайшоўшы ў Менск 21 лютага, немцы ўжо 25 лютага занялі будынак Народнага сакратарыята, знялі з яго бел-чырвона-белы сцяг, у самім памяшканні зрабілі вобыск і забралі касу.

Троцкі не споўніў свайго абяцання – 3 сакавіка 1918г. Беларусь падзялілі Нямеччына і Савецкая Расея. Вядома, прадстаўнікоў ад Беларусі ў Брэст-Літоўску не было ніводнага. Толькі ў адказ на гэта 9 сакавіка Народны сакратарыят у другой Устаўной грамаце абвясціў Беларусь Народнай Рэспублікай (БНР). Акт 9 сакавіка мае гістарычнае значэнне і затым, што айцы БНР сфармулявалі ў другой Устаўной грамаце свой ідэал беларускай дзяржаўнасці. Беларусь бачылася ім дэмакратычнаю, прававою, сацыяльнаю Рэспублікай – з усеагульным выбарчым правам, са свабодаю сумлення, слова, сходаў, з забеспячэннем права на зямлю тым, хто на ёй працуе.

І ўсё ж другая Устаўная грамата была кампрамісным дакументам. Беларусь абвешчана Народнай Рэспублікай, але нічога не сказана пра яе дачыненні з Расеяй, з іншымі дзяржавамі.

Немцы па ўмовах Берасцейскага трактату абавязаліся не прызнаваць ніякіх новых дзяржаў, абвешчаных пасля падпісання мірнага дагавору. Нямеччына лічыла Беларусь акупаванаю расейскаю тэрыторыяй і не хацела прызнаваць БНР, псаваць стасункі з урадам Леніна.

Гэта адна з прычын таго, што аўтанамісты ва ўрадзе БНР 23 сакавіка апынуліся ў меншыні. Другая прычына, як успамінаў Антон Луцкевіч, заснавальнік і відны дзеяч БСГ, – у адсутнасці грошай. Грошы меўся пазычыць урад Украіны. Але каму? Беларускай дзяржаве ці акупаванай част-

*Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына... (Я. Купала)*

# НЕЗАЛЕЖНАСЦІ




**Паштоўка БНР**

цы Расеі? Урад самастойнай дзяржавы можа даць крэдыт толькі ўраду самастойнай дзяржавы. Так аргументаваў Луцкевіч сваё выступленне на пасяджэнні Народнага сакратарыяту. А напрыканцы дадаў, што абвяшчэнне незалежнасці будзе пратэстам супраць Берасцейскага міру, супраць падзелу Беларусі.

24 сакавіка ў 8 гадзін вечара сабралося пленарнае пасяджэнне Рады БНР. Спрэчкі ішлі вакол самой ідэі незалежнасці (супраць яе выступалі расейскія эсэры, меншавікі і габрэйскія сацыялістычныя партыі), вакол фармулёвак. Працавалі, спрачаліся 12 гадзін. У 8 гадзін раніцы 25 сакавіка тэкст трэцяй Устаўной граматы быў прыняты. У ёй пацвярджаліся ўсе правы і свабоды грамадзян, абвешчаныя другой Устаўной граматай, і гаварылася: "Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнаю і вольнаю дзяржавай". Абвяшчалася непадзельнасць БНР у этнаграфічных межах Беларусі. Выданнем трэцяй Устаўной граматы Рада БНР падкрэслівала, што яна не прызнае савецка-германскі дагавор ад 3 сакавіка 1918г. (Берасцейскі мір), які падзяліў беларускі народ на дзве часткі. Не прызнаваўся таксама і той урад, які падпісаў за Беларусь гэты дагавор. Рада БНР дала даручэнне ўраду – Народнаму сакратарыяту – паставіць пытанне перад зацікаўленымі бакамі аб пераглядзе той часткі Брэсцкага мірнага дагавора, якая датычыла Беларусі.

Афіцыйны ўрад Расеі не прызнаваў БНР. Германскае ж ваеннае камандаванне фармальна рабіла тое самае, а на справе ўжо 27 сакавіка была аб'яўлена дэкларацыя, у якой прызнаваліся ўсе краёвыя структуры ўлады. Ім акупанты перадалі некаторыя адміністрацыйныя функцыі. Такі крок быў абумоўлены тым, што немцы ў выпадку пазітыўных для іх вынікаў вайны хацелі б бачыць БНР дружалюбнай дзяржавай-сатэлітам.

Доля Беларусі кайзераўскую Нямеччыну не цікавіла, нягледзячы на тэлеграмы і звароты Рады БНР да канцлера, а таксама да імператара Вільгельма. Тэлеграма да яго стала прычынай вострага палітычнага крызісу ў Радзе БНР.

Рада і Народны сакратарыят БНР прыкладалі намаганні для арганізацыі беларускіх нацыянальных інстытутаў у цэнтры і ў правінцыі. 27 сакавіка 1918г. абвешчана пастанова Рады пра тое, што яна бярэ ўсю паўнату ўлады ў краі ў свае рукі. Пасля таго, як у Радзе і Народным сакратарыяце БНР умацаваліся пазіцыі правых, палепшыліся адносіны да гэтых органаў з боку камандавання 10-й арміі рэйхсвера, якая дыслацыравалася на тэрыторыі Беларусі, хоць берлінскі ўрад па-ранейшаму ставіўся да БНР адмоўна. 27 траўня камандуючы 10-й арміяй прыняў прадстаўнікоў Рады. Каб змякчыць адносіны паміж акупантамі і насельніцтвам, ён хацеў бачыць у асобе Рады пасярэдніка паміж нямецкімі ўладамі і беларускім народам. Дзеля асягнення гэтай мэты 21 чэрвеня нямецкае камандаванне дало, у прыватнасці, згоду на ўтварэнне пры павятовых камендатурах інстытутаў дарадчыкаў. Пасля таго, як у чэрвені ўрад БНР аб'явіў нядзейнымі на тэрыторыі Рэспублікі дэкрэты і пастановы ўрада РСФСР, акупацыйныя ўлады перадалі ў кампетэнцыю Народнага сакратарыята гандаль, прамысловасць, сацыяльную апеку, асвету і культуру.

Найбольшыя вынікі былі асягнутыя ў галіне культуры і адукацыі. Народны сакратарыят прыняў пастанову аб дзяржаўным статусе беларускай мовы зараз па абвяшчэнні БНР. Ад пачатку красавіка 1918г. пры Народным сакратарыяце асветы БНР пачалі функцыянаваць курсы беларусазнаўства, дзе чыталіся лекцыі з беларускай гісторыі, геаграфіі, мовы, літаратуры. Важнай галіной дзейнасці сакратарыята асветы было адраджэнне нацыянальнае школы. Калі на пачатку 1918г. у Менску былі чатыры нацыянальныя школы, то ў чэрвені іх было ўжо дваццаць. Усяго ж, паводле розных падлікаў, працавала ад 150 да 350 беларускіх школ, а таксама гімназіі ў Менску, Навагрудку, Слуцку і Гародні. У Менску адчыніўся Беларускі педагагічны інстытут. Падрыхтоўка настаўнікаў ішла і ў Свіслацкай семінарыі. У красавіку 1918г. заснавана Менская вышэйшая музычная школа, якая ў тым жа годзе была перайменавана ў Беларускую кансерваторыю. У красавіку створана падрыхтоўчая камісія для адкрыцця Беларускага універсітэта ў Менску.

Шырока разгарнулася выдавецкая справа. У 1918г. функцыянавала 11 выдавецтваў. Пры ўрадзе БНР былі заснаваны бюро для падрыхтоўкі падручнікаў і выдавецтва "Прасвета". Гэтае бюро за 4 месяцы склала 16 кніг для вучняў. З ініцыятывы Івана Луцкевіча ў 1918г. створана першая навуковая ўстанова – Беларускае навуковае таварыства ў Вільні. Ішло прыгатаванне да адкрыцця Віленскай Беларускай гімназіі. Пад апекай урада БНР пачало працаваць створанае Фларыянам Ждановічам Першае Беларускае таварыства драмы і камедыі. 19 траўня 1918г. на Ляхаўцы ў Менску быў адчынены Беларускі Народны дом імя Максіма Багдановіча, які стаў сядзібаю дзяржаўнага тэатра БНР.

Народны сакратарыят дамагаўся міжнароднага прызнання БНР. У чэрвені дэлегацыя БНР на чале з Р. Скірмунтам наведала з візітам Кіеў. Урад Украіны прызнаў беларускую дзяржаву. Адразу ж былі наладжаныя дыпламатычныя і гандлёва-эканамічныя адносіны. Беларускае генеральнае консульства было адчынена ў Кіеве, у Адэсе – консульства БНР. Беларускія дыпламатычныя місіі былі адчыненыя ў Маскве (консульскія функцыі выконваў А. Бурбіс), Растове, Стаўрапалі, Рызе, Таліне, Стамбуле, Берліне, у іншых гарадах свету. Грамадзяне БНР атрымлівалі пашпарты, у тым ліку дыпламатычныя. Функцыянавала Беларускае прэс-бюро. Апроч Украіны, незалежнасць БНР прызнавалі дэ-юрэ Фінляндыя, Аўстрыя, Турцыя, Эстонія, Латвія, Чэхаславакія, Арменія і Грузія. Але ўрады краёў Антанты і ЗША не праявілі зацікаўленасці ў БНР, каб не пазбавіць сябе адчыненых дзвярэй для інтэрвенцыі ў Расею.

Можна толькі гадаць, што здарылася б, калі б Акт аб Незалежнасці быў прыняты 20 лютага, або, прынамсі, да Берасцейскага міру. Але ва ўсякім разе можна сцвярджаць, што БНР была, паводле азначэння гісторыка Юрыя Туронка, нежаданаю Рэспублікай (вядома, тут гаворка не пра стаўленне саміх беларусаў да сваёй Рэспублікі!). Маецца на ўвазе, што яе не жадалі ні Расея, ні Польшча, ні Нямеччына, ні Літва, ні краіны Антанты. Узяўшы пад увагу гэты факт, можна сказаць, што заснавальнікі БНР былі смелыя людзі, якія ішлі насуперак жаданню суседзяў, акупантаў і ўнутраных ворагаў беларушчыны.

Восенню-зімой 1918г. нямецкія войскі былі выведзены з тэрыторыі Беларусі. Пасоўваючыся за адступаючым праціўнікам, Чырвоная Армія хутка займала гарады і сёлы і стварала органы савецкай улады: ваенныя саветы, рэвалюцыйныя камітэты і г.д.

Рада БНР апынулася ў палітычнай ізаляцыі. Ні пісьмо прэзідэнту ЗША Вільсану, ні перамовы з СНК РСФСР не прынеслі пазітыўных вынікаў. Свайго ж войска БНР не мела, бо нямецкія акупацыйныя ўлады фарміраваць яго не дазвалялі. Патрэбнае на той час палітычнае развязанне пытання таксама з розных прычын стала немагчымым. 28 лістапада 1918г. адбылося апошняе ў гэтым годзе пасяджэнне Рады БНР у Менску. Была прынята Грамата з заклікам ствараць беларускія Рады сялянскіх і рабочых дэпутатаў. Са снежня 1918г. сябры Рады і ўрада БНР пераехалі ў Вільню. Наступленне Чырвонай Арміі і дзейнасць польскай пятай калоны змусілі кіраўніцтва БНР пераехаць 27 снежня ў Горадню. У канцы сакавіка 1919г. урад БНР выехаў у Берлін, у пачатку верасня таго ж года Рада БНР вярнулася ў захоплены польскімі войскамі Менск. У 1920г. Прэзідыум Рады БНР і ўрад пераехалі ў сталіцу Літвы Каўнас, але палітыка літоўскага ўрада прывяла да таго, што 1 лістапада 1923г. Прэзідыум Рады і ўрад БНР выехалі з Каўнаса ў Прагу...

25 сакавіка ўпершыню ўсе этнаграфічныя тэрыторыі Беларусі былі абвешчаны адзінай дзяржавай, дзе беларусы не павінны былі быць людзьмі другога гатунку. Як бачым, БНР не была фікцыяй. Дзеячы БНР рабілі для свайго краю ўсё, што маглі, і зрабілі нямала. Тым, хто хацеў незалежнасці давялося пераадольваць супраціўленне не толькі вонкавых, але і ўнутраных ворагаў – рознага кшталту аўтанамістаў і «общерусских» (-польскіх або якіх-яшчэ-там) людзей. Нават для многіх ветэранаў беларускага руху слова "незалежнасць" гучала надта звонка. Гэта пасля пункт "незалежнасць" стаў абавязковым у праграмах беларускіх палітычных партый і арганізацый.

Беларускі нацыянальны рух займеў новы сімвал, побач з Пагоняй і бел-чырвона-белым сцягам. Гэтым сімвалам зрабілася дата. Святкаванне ўгодкаў абвяшчэння незалежнасці было адначасова выражэннем надзеі, што Беларусь не згіне, што яна адродзіцца.

У наш час гэтае светлае свята азмрочваецца, на жаль, няпэўнасцю будучыні свайго краю. Вось жа, адзначаючы яго чарговы раз, не дазваляйма сабе забыцца, што гэтая будучыня – у нашых руках.

**Снегавінка**

# МОЛАДЗЕВАЯ СУБКУЛЬТУРА

**"НЕ ТАЯ ЦЯПЕР МОЛАДЗЬ, ШТО БЫЛА РАНЕЙ, – ПАСКАРДЗІЦЦА ЯКАЯ-НЕБУДЗЬ БАБУЛЬКА, ГЛЕДЗЯЧЫ НА ХЛОПЦА З ДЗЯЎЧЫНАЮ, ШТО ТЫМ ЧАСАМ ЦАЛУЮЦЦА НА ТРАЛЕЙБУСНЫМ ПРЫПЫНКУ. – АДНЫЯ ТОЛЬКІ ГУЛІ ДЫ ДЫСКАТЭКІ Ў ГАЛАВЕ, А ЎЖО МУЗЫКА – ХОЦЬ ВУШЫ ЗАЦІСКАЙ, БО СЛУХАЦЬ БРЫДКА".**

Так, моладзь цяпер не тая, што тут казаць, але ў сваіх поглядах на жыццё, грамадства, мову, культуру маладыя людзі паміж сабою адрозніваюцца. І сёння хацелася б знайсці адрозненні ў музычных густах беларускай моладзі.



Фота: ByMedia.net

## "ГОП, ГОП, ГОП, А Я ТАНЦУЮ"

"Гопнікамі" часцей за ўсё клічуць тых хлопцаў ды дзяўчат, што кожную суботу завісаюць на дыскатэках тыпу "Шайба", не прапускаюць ніводнага "фабрычнага" канцэрта, а з іх магнітафонаў кожны дзень гучаць розныя Цімаці, Пьехі, Рэфлексы і час ад часу Сярдзючкі.

Слухаючы ўвесь бруд расейскай, а цяпер і беларускай эстрады (вось дзе славутыя 75% эфіру), яны тое, што падабаецца асабліва, спяваюць і могуць свае спевы запісваць на магнітафон, марачы аб будучыні суперзоркі.

Яшчэ адна вельмі цікавая акалічнасць у тым, што такая моладзь (большасць жаночага полу) лічыць музыкай толькі тое, што гучыць па TV ды FM-радыё, а калі сябар ці сяброўка прапануе: "На, вось, паслухай цікавы гурт", дык ён ці яна хутчэй адкажа: "Ты что? Впервые слышу о такой группе. Как это можно слушать? Это ведь не популярно!"

Што такім адкажаш? Яны каго заўгодна пераканаюць, што "Корні" – гэта лепшы гурт у свеце, а тэксты іхніх песняў прасякнуты глыбокім сэнсам.

## ПАНКІ НЕ ПАМЕРЛІ, ЯНЫ ПРОСТА ТАК ПАХНУЦЬ

"Хто такія панкі?" – спытаеце вы. Адказаць адразу цяжка. На мой погляд, гэта маладыя людзі ва ўзросце 14-19 гадоў (потым яны разумнеюць, бо немагчыма ж ўсё жыццё крычаць: "Punks not dead"), якія носяць чорныя аблезлыя байкі з надпісамі: "ГрОБ", "Кино", "КиШ" ды літарай "А" ў коле (гэта яны называюць Анархіяй).

Панкі слухаюць у большасці расейскі рок, панкрок ды некаторыя беларускія панк- і хардкор-гурты. У вялікай колькасці у Берасці іх можна сустрэць у клубах "На Вульцы", "Дыскаклуб", а таксама на канцэртах "Дай дарогу", "Садъ".

Панкамі становяцца не толькі дзеці з так званых "неблагополучных семей", якім чагосьці не хапае ў жыцці, але і дзеці заможных бацькоў, якім хочацца новых уражанняў ці проста выпендрыцца перад сваімі аднагодкамі. Насцярожвае тое, што такія панкі часцяком збіраюцца толькі каб бухнуць, пакурыць травы, нюхнуць "Момент". Яны збіраюцца, напрыклад, у скверы Свабоды, каб паспяваць улюбёныя песні пад гітару.

## МЕТАЛЮГІ

Так сабе клічуць хлопцы і дзяўчаты, якія слухаюць цяжкую музыку ад heavy да паган-металу, як напрыклад Deadmarsh, Children of Bodom, Cannibal Corpse, Ария ці ўжо класіку сусветнага року: Led Zeppelin, Black Sabbath, Deed Purple.

У большасці гэта даволі разумная, інтэлектуальная моладзь, якая вучыцца ў ВНУ. Яна збіраецца разам, каб папіць піва, паразважаць на вечныя тэмы ды палабаць на гітары ў коле сяброў.

Сярод агульнай масы такія людзі вылучаюцца ў першую чаргу доўгімі валасамі, касухай ды іншымі атрыбутамі сапраўднага металюгі. Прыярытэтным з'яўляецца чорны колер. Але для большасці з іх усё гэта не галоўнае, як сярод панкаў, – галоўнае, каб у галаве нешта было.

Берасце у гэтых адносінах не вельмі металёвы горад, калі параўноўваць з Менскам, Гомлем ці Гародняй. Тут у асноўным адбываюцца панкаўскія ды хардкораўскія вечарыны.

## "ПУСТЫЕ СТЕНЫ – ПУСТЫЕ ГОЛОВЫ"

Такі рэперскі дэвіз можна апошнім часам убачыць у розных кутках Берасця.

Усе рэперы дзеляцца на тых, хто слухае толькі рэп, для іх астатняя музыка "поўны фуфел", і на тых, хто акрамя рэпу цікавіцца іншымі музычнымі стылямі: рэгі, ска, хадкор і інш.

Сярод натоўпу рэпер вылучаецца даволі нятаннай вопраткай, на некалькі памераў большай за патрэбную: шырокія нагавіцы, байка, вялікія гаўнаступы "Adidas" – усё яркіх колераў.

Кожны рэпер павінен мець свае балоны з фарбамі, маркеры розных таўшчынь, царапкі, стыкеры, каб "бамбіць" на сценах ды вокнах усяго, што не дагледжана. Але для таго, каб гэтым займацца, патрэбны грошы, таму большасць сапраўдных закаранелых рэпераў добра забяспечаны бацькамі.

Пад словам "рэпер" хаваюцца людзі, якія маюць розныя захапленні: адныя займаюцца брэйкам, другія размалёўваюць сцены, трэція драпаюць шкло ці распісваюць дзверы ў грамадскім транспарце, чацвёртыя чытаюць рэп ці фрыстайляць, а пятыя проста выпільваюць лобзікам, бо больш нічога не ўмеюць.

Рэперскія тусоўкі арганізуюць свае вечарыны, на якіх збіраюцца разам і адпачываюць так, як ім падабаецца.

## ХУТЧЭЙ ЗАЦЯГВАЙ!

Усё больш і больш з'яўляецца моладзі, якая называе сябе растаманамі.

Яны слухаюць музыку, якая нарадзілася на берагах Ямайкі: рэгі, ска, любяць і вераць ДЖА, некаторыя заплятаюць растаманскія косы – дрэды, але ўсіх іх аб'ядноўвае кайя ці, каб было больш зразумела, канапля. Гэтых людзей можна ўбачыць з прыемнай усмешкаю на твары ды жоўта-чырвона-зялёным шалікам на шыі.

У Берасці адбываюцца рэгі-вечарыны, дзе растаманы збіраюцца разам, каб патанчыць пад прыемныя рытмы "музыкі Сонца".

**P.S. Гэта, канешне ж, не поўны спіс усіх музычных прыхільнасцяў беларускай моладзі. Можна было б яшчэ ўспомніць хіпаноў, кіслотнікаў, рэйвераў, кораўцаў, але няхай гэта зробіць нехта іншы.**

**Сцёпка з-пад Смаленску**

# СТАЖИРОВКИ В ПОЛЬШЕ И ФРАНЦИИ

Целью программы является создание для активной молодёжи возможностей получения опыта в области демократических преобразований и функционирования гражданского общества в странах Европейского Союза. В рамках программы WSB будут проводиться стажировки, образовательные поездки и обмен молодёжью из стран Восточной Европы и Средней Азии.

Стажировки длятся 3 месяца и будут проходить в г. Вроцлав, Гданьск (Польша) и в La Vienne (Франция).

1. Стажировки предназначены для студентов последних курсов и лиц до 40 лет.

2. Участниками могут быть лица, принимающие активное участие в жизни общества.

3. Требования к участникам программы: хорошее знание языка страны, в которой будет проходит стажировка (Польша, Франция) или хорошее знание английского языка.

Для участия в программе необходимо отправить на адрес: wsb@kew.org.pl следующие документы:

1. заполненную аппликацию,
2. резюме,
3. рекомендательное письмо,
4. другие документы.

Срок подачи документов: до 10 апреля 2005 г.

УСЛОВИЯ ПРЕБЫВАНИЯ:

Организаторы стажировки предоставляют:

1. проживание,
2. питание,
3. необходимую литературу,
4. средства на карманные расходы.

Дополнительная информация по программе, а также анкета для участия в этой программе находятся на странице:

http://www.edudemo.home.pl/bridge/index.php.

За дополнительной информацией по вопросам участия в программе можно обращаться в офис «Дзедзіча». Там же можно получить образец анкеты. Звоните: (0162) 23-68-02.

**Dzedzich week-news**

# МОВА КВЕТАК


Фота: ByMedia.net

**КВЕТКІ СА СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ НЕ ТОЛЬКІ ЎПРЫГОЖВАЛІ ПОБЫТ ЛЮДЗЕЙ, АЛЕ І НЕСЛІ З САБОЮ ШМАТ СІМВАЛАЎ. ПАДАРЫЎШЫ ТУЮ ЦІ ІНШУЮ КВЕТКУ, МОЖНА БЫЛО ПРЫЗНАЦЦА Ў КАХАННІ, ВЫКАЗАЦЬ ЗАХАПЛЕННЕ, АБУРЭННЕ, ЗБЯНТЭЖАНАСЦЬ, ПАПЯРЭДЗІЦЬ ПРА НЕБЯСПЕКУ І Г. Д. ТУТ ІГРАЛА РОЛЮ КОЖНАЯ ДЭТАЛЬ: КОЛЬКАСЦЬ КВЕТАК, ІХ КОЛЕР, СУСЕДСТВА З ІНШЫМІ КВЕТКАМІ, РАЗМЯШЧЭННЕ ЛІСЦЯ... НАТУРАЛЬНА, ШТО КАЛІ КВЕТКАМІ МОЖНА БЫЛО "ДАСЛАЦЬ ЛІСТ", ТО ІМІ Ж МОЖНА БЫЛО "АДПРАВІЦЬ АДКАЗ". ТАКАЯ ПЕРАПІСКА КУДЫ БОЛЬШ РАМАНТЫЧНАЯ І КУДЫ БОЛЬШ ГАВОРЫЦЬ СЭРЦУ, ЧЫМ ЗВЫЧАЙНАЯ.**

Некаторыя крыніцы сцвярджаюць, што мова кветак нарадзілася ў эпоху рамантызму і на працягу больш як ста гадоў з'яўлялася неад'емнай часткай сентыментальных гульняў закаханых. Кветкі дапамагалі закаханым весці маўклівы дыялог, выражаць складаную гаму перажыванняў. Напрыклад, гіяцынт па колькасці бутонаў "прызначаў" дзень спаткання, а званочак па колькасці кветак "удакладняў" нават гадзіну спаткання. Мова кветак на Усходзе склала цэлую навуку "селам", а лепшым "даведнікам" сімвалічнага значэння кветак прызнаецца японская экібана.

## ЗНАЧЭННЕ КВЕТКІ

**Азалія** абазначае смутак, выклікаены адзінотай, **гвалдзікі** спрабуюць упэўніць: "Нават калі між намі ўзнікаюць сваркі, я гатовы іх вырашыць!". Белы гвалдзік выказвае давер, а чырвоны – палымяныя пачуцці. Букет **бэзу** выражае надзею на тое, што адрасат усё яшчэ прыхільны і добразычлівы. Дзякуючы **рамонкам** можна даведацца, што Ваш сябар пакутуе, магчыма Вы занадта жорсткія з ім. Вось ён і цяпер варожыць: кахае – не кахае?.. Калі дзяўчыне дораць **вяргіні** – гэта знак смутнага непадзельнага кахання. Англічане дораць сваім каханым **браткі**. Іх пачуцці могуць быць выказаны толькі пры дапамозе гэтых цудоўных кветак. Кветкай, што ўвасабляе чыстае і светлае каханне, у многіх еўрапейскіх народаў да сённяшняга дня лічыцца **белая акацыя** – сімвал пяшчоты і надзея на новае спатканне. У Нямеччыне і зараз лічаць **ландышы** гарантам шчасця ў сямейным жыцці. Падораныя **пралескі** сведчаць пра нараджэнне першага кахання, дорачы **канюшыну** чалавек просіць, каб Вы выявілі нарэшце свае пачуцці, а паднесеныя **васількі** раскажуць Вам, што іх дарыцель даўно Вас кахае, але не мае смеласці прызнацца ў гэтым. **Званочкі** – гэта прамое пытанне: "А якой гадзіне мы сустрэнемся?" **Стакроткі** – кветкі маладых дзяўчат, варта падарыць іх, і дзяўчына без шматслоўных тлумачэнняў зразумее, што малады чалавек з кожным днём усё больш і больш адчувае ў ёй патрэбу. **Незабудка** абяцае падтрымку ў горы і ў радасці, а **сланечнік** – адданасць і велізарнае шчасце ўдваіх. **Цюльпан** – гэта знак, што дзеля каханых часам трэба пераадолець празмерны гонар і адшукаць кампраміс, і тады **ружы**, асабліва чырвоныя, стануць весткай шчасця, таму што яны – сімвал кахання.



## КОЛЕР

Сваю ўласную сімволіку мае кожны колер кветкі. І пра гэта нельга забываць. **Чырвоны** колер абазначае жыццё, каханне, свабоду і, у той жа час, агонь, кроў, **малінавы** – сталыя адносіны, а **ружовы** – свежасць пачуццяў. **Аранжавы** колер кажа пра тое, што чалавек часам занадта ганарлівы і высакамерны, **жоўты** абазначае нявернасць і рэўнасць, **фіялетавы** – сяброўства. **Блакітны** колер – гэта чысціня, цнота, далечыня, а **ліловы** – сапраўднае, самаахвярнае каханне. Смутак, бясконцасць і ў той жа час вернасць і надзейнасць выражае **сіні** колер. Букет сініх ірысаў, падораны каханай жанчыне, нагадае ёй, што ў яе ёсць на каго абаперціся. Мір, спакой і пасіўнасць сімвалізуе **зялёны** колер, аднак яго адценне, **зеленавата-жоўты**, выражае нянавісць, зайздрасць, нявернасць, таму не варта дарыць жанчыне зеленавата-жоўтую архідэю, каб не выклікаць падазрэнняў.

**Белы** – нейтральны колер, які моцна кантрастуе з усімі цёмнымі колерамі, ён прыўносіць святло, вяселле, асабліва ўзмацняе святочнае гучанне чырвонага. Ён сімвалічна ўспрымаецца як чысціня, цнота; а ў некаторых краінах у сувязі з рэлігійнымі традыцыямі сінтаізму, будызму і некаторых іншых рэлігій – жалобу. Белыя кветкі добрыя ўсюды, яны знак пяшчоты, даверу. Чалавек, які любіць белыя кветкі, імкнецца да ідэалу, але яго лёгка пакрыўдзіць. **Чорны і карычневы** колеры абазначаюць смутак, сур'ёзную ўрачыстасць, жалобу. Але гэта не азначае, што нельга дарыць кветкі гэтага колеру тым, хто іх любіць. З гэтым колерам трэба быць больш асцярожным. Чорныя ружы, напрыклад, добрыя толькі тады, калі яны да месца або іх вельмі любіць адрасат. Не варта дарыць іх занадта часта і не ў час.

## ЗНАЧЭННЕ КОЛЬКАСЦІ КВЕТАК

У кожнай кветкі і яе колера ёсць сваё значэнне. Шмат гаворыць таксама і колькасць кветак. Няцотная колькасць кветак надзяляе букет станоўчай жыццёвай энергіяй і гармоніяй. На мове кветак і ў лічбаў ёсць сакрэтнае значэнне, так што будзьце ўважлівыя...

1 кветка – "Ты ўсё, што ў мяне ёсць!"
3 кветкі – "Хачу з'ехаць з табой на край свету!"
5 кветак – "Я кахаю цябе!"
7 кветак – традыцыйна даруюць у дзень заручынаў.
9 кветак – "Я паважаю цябе як сябра"
10 кветак – "Хачу што-небудзь для цябе зрабіць"
11 кветак – "Ты мой сябра"
12 кветак – "Нам цяжка, але я думаю, што ўсё будзе добра"
13 кветак – "Адчуваю да цябе нянавісць"

Быць можа, у сучасным экстравагантным свеце не месца такім дробязям, як мова кветак, але псіхолагі сцвярджаюць, што менавіта такія дробязі ствараюць настрой, няхай нават на падсвядомым узроўні. Думаецца, што мастацтва камунікаваць пры дапамозе кветак і ў наш час не страціла сваёй актуальнасці.

## КВЕТКАВЫ СЛОЎНІК

Архідэя – прыгажосць
Астра – прыгажосць хуткаплынная
Бальзамін – "мы з табою ў няроўных адносінах"
Барвінок – светлы ўспамін
Браткі – "не забывай пра мяне"
Вяргіня – гонар і павага
Дзьмухавец – "кажу праўду"
Жасмін – сяброўскія адносіны
Ірыс – "хачу табе нешта сказаць"
Лаванда – шчырасць, адкрытасць
Ландыш – вяртанне шчасця
Лілія – сарамлівасць, сціпласць
Магнолія – "хачу Вас кахаць"
Мак – сон
Мімоза – пачуццёвасць
Нарцыс – самаўлюбёнасць
Незабудка – шчырае пачуццё
Півоня – выхвалянне
Бэз – закаханасць
Флокс – узаемнасць, адзінства
Фіялка – сціпласць
Хрызантэма – адкрытасць, прыязнасць

## МАЛЕНЬКІ СЛОЎНІК КВЕТАК

Браткі – анютины глазки
Бэз – сирень
Вяргіня – георгин
Дзьмухавец – одуванчик
Званочак – колокольчик
Канюшына – клевер
Пралеска – подснежник
Стакротка – маргаритка

**А. Лена**

# ВАЙНА... ПАКУТЫ... СМЕРЦЬ... МАСТАЦТВА...



М.Савіцкі

**ЯК ВЯДОМА, НАВАКОЛЛЕ АДЛЮСТРОЎВАЕЦЦА Ў ПРАЦАХ НАЙПЕРШ ЛЮДЗЕЙ ТВОРЧЫХ: ПАЭТАЎ, МУЗЫКАЎ, МАСТАКОЎ. ЯСКРАВЫЯ, ВАЖНЫЯ МОМАНТЫ ЖЫЦЦЯ, НАВАТ КАЛІ ЯНЫ БЫЛІ ТРАГІЧНЫМІ, ЗАСТАЮЦЦА Ў ТВОРАХ МАСТАЦТВА, У ПАМЯЦІ ЛЮДЗЕЙ НАЗАЎСЁДЫ.**

Міхаіл Андрэевіч Савіцкі – жывапісец, народны мастак Беларусі, член-карэспандэнт Акадэміі мастацтва СССР, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і БССР. Нарадзіўся ён 18 лютага 1922г. у вёсцы Звяначы (Віцебская вобласць). Скончыў Менскае мастацкае вучылішча (1951) і Маскоўскі дзяржаўны мастацкі інстытут (1957). Прайшоў вайну, быў вязнем Бухенвальда.

Менавіта вайна пакінула ў душы мастака крывавую рану, якая не зацягвалася доўгі час. Яго творы "Гонар абавязку" (1958), "1941" (1961), "Партызаны" (1964) , "Аршанскія партызаны", "Партызаны. Блакада", "Партызанская мадонна" (1967), "Віцебская брама", "Пакаранне смерцю", "Легенда пра Міная Шмырова" (1968) добра гэта пацвярджаюць. Творы вайны напоўнены глыбінёю, жахам, крывёю простых людзей, слязьмі мацярок.

Карціну "Партызанская мадонна" параўноўваюць нават з "Сікстынскай мадоннай" Рафаэля, гаворачы, што сюжэт Савіцкі ўзяў адтуль. Але ці так гэта? Гледзячы на "Партызанскую мадонну", адчуваеш боль і цяжар, якія схаваны ў сэрцы гэтай жанчыны. У Рафаэля ўсе наадварот: яго "мадонна" лётае ў небе ад шчасця.



**Партызанская мадонна**

Многія мастацтвазнаўцы крытыкуюць Савіцкага за тое, што ўсё ён робіць "не так, як трэба". Напрыклад, лічаць, што "піраміду" з трупаў людзей (у адной з карцін, дзе намаляваны памерлыя) ён намаляваў нерэалістычна – усе яны чыстыя, без слядоў крыві, сінякоў, якія павінны былі застацца ад катаванняў. Але Савіцкі мастак, а не фатограф, і гэта яго поўнае права – маляваць так, як яму ўяўляецца і хочацца.

Гледзячы на карціны Савіцкага, прысвечаныя ваеннай тэматыцы, разумееш і адчуваеш жах вайны, нібы сам там пабываў. Твары ягоных персанажаў раскажуць нам нашмат больш, чым любы падручнік па гісторыі – столькі болю схавана ў іх.

Значнае месца ў творчасці Савіцкага займаюць партрэты, адметныя глыбокім пранікненнем у сутнасны стан чалавека, раскрыццём псіхалагізму праз выкарыстанне мінімальных сродкаў выяўлення. Гэта такія працы, як "Віленскія сустрэчы" (1976), "Дастаеўскі" (1988), "Філосафы" (1994), "А.Пушкін і А.Міцкевіч" (2000).

З высокай мастацкай пераканаўчасцю адлюстравана ў творчасці Савіцкага шматграннасць Чарнобыльскай катастрофы ("Плач аб зямлі", "Чарнобыльская мадонна", "Эвакуацыя", "Забароненая зона" і інш.)

З 1991г. М.Савіцкі – кіраўнік Творчых акадэмічных майстэрняў Міністэрства культуры Беларусі.

**Ганна**

# АЎТАСТОПАМ У КРАКАЎ

**НА ПАЧАТКУ ДРУГОГА КУРСА МЯНЕ АПАНАВАЛА ЖАДАННЕ З'ЕЗДЗІЦЬ КУДЫ-НЕБУДЗЬ АЎТАСТОПАМ ЗА МЯЖУ. ЛЕТА БЫЛО ПРАВЕДЗЕНА БЯЗМЭТАВА, І ТАМУ Я ВЫРАШЫЎ ПАЕХАЦЬ У ПОЛЬШЧУ.**

Вырашыў – паеду ў Кракаў, горад, які за сваю прыгажосць занесены ў спіс сусветнай спадчыны. І вось 25 кастрычніка, у пятніцу, пасля дзвюх параў рвануў у інтэрнат, хутка сабраў заплечнік і рушыў да кнігарні. Набыў атлас дарог, сеў на аўтобус №1 і даехаў да Варшаўскага маста.

Падыходжу да чаргі аўтамашынаў. Акрамя мяне на падсадку было вельмі шмат жанчын узросту маёй маці, якія везлі ў Польшчу спірт і цыгарэты. Машыну знайшоў не адразу, але ўрэшце кіроўца з Пінску пасля невялікага хістання пагадзіўся давезці мяне да Бялай Падляскі. Перад шлагбаумам правяралі наяўнасць квітка з аплатай за «экалогію», якога у мяне не было. Прыйшлося бегчы ў канец чаргі і аплочваць. Тут адбыўся прыкол: не паспеў я дабегчы да шапіка, як насустрач выйшаў міліцыянт і крычыць: "Ты чаго, казёл п'яны, выпендрываешся". Я так і застыў на месцы. Міліцыянт выхапіў з маёй нагруднай кішэні пашпарт. Я кажу:

- Што здарылася? Я не п'яны, бягу аплочваць экалогію, мяне машына чакае.

– Памежнік прыйдзе, і разбярэмся, хто ты такі.

Азірнуўшыся, я зразумеў у чым справа: з боку мяжы бег падвыпіўшы мужык. Відаць, яго ў такім выглядзе не прапусцілі цераз мяжу і ён не знайшоў нічога лепшага, як кінуць машыну і пусціцца наўцёкі.

Атрымаўшы свой пашпарт, я імгненна аплаціў гэту чортаву экалогію і пабег да машыны. На шчасце, абедзве мяжы былі пройдзены без вялікіх праблем, і кіроўца высадзіў мяне перад Бялай Падляскай. Развітаўшыся з ім, я пачаў стопіць.

Стопіў я гадзіны тры і ўсё безвынікова. Ужо сцямнела. Добра, што былі ліхтары, пад святлом якіх я і стаяў. Замерз – не апісаць: у мяне не было нават курткі. Я ўжо не ведаў што рабіць: ці то варочацца, ці то ісці шукаць начлег. Аднак вось затармазіў "кракадзіл", у якім сядзеў памежнік. Я крыху збянтэжыўся, адразу падумаў: "можа праверка дакумантаў", – але ўсё абыйшлося. ¨н проста хацеў мяне падвесці. ¨н таксама здзівіўся, калі даведаўся, што я – беларус. Па дарозе мы разгаварыліся, і памежнік распавёў, што едзе ў госці да маці пад Люблін. Аказаўся ён нармальным чалавекам, у машыне я сагрэўся і вырашыў спытаць, ці ёсць мяжа паміж Польшчай і Нямеччынай, і як яна ахоўваецца. На што ён даў станоўчы адказ і паглядзеў на мяне так, што жаданне задаваць гэткія пытанні кудысьці знікла.

Так я даехаў да Мянджынца-Падляскага, дзе перакрыжоўваюцца дзве аўтастрады. У прынцыпе, бліжэй было пайсці стопіць на Люблін, бо ад яго меншая адлегласць да Кракава. Аднак машын на гэтай трасе было мала, ды і памежнік параіў ехаць да Варшавы, так як там больш шанцаў.

Хвілін праз дзесяць мяне падабраў малады хлопец на "Фіяце", які ехаў у Варшаву. Пра машыну трэба распавесці асобна. "Фіят" з выгляду быў звычайнай малалітражкай, аднак калі мы разганяліся, было такое адчуванне, што ты ў гоначнай машыне. Аказалася, што ў машыне стаіць рухавік ад "Альфа-Рамэа" аб'емам 2.0. Па словах уладальніка, на аўтасервісе ў Бялай-Падляскі збегліся ўсе механікі паглядзець на такую машыну.

А вось і Варшава – уся ззяе агнямі. Уражанні проста супер… Калі я сюды прыехаў праз месяц, але ўжо днём, уражанні былі ўжо не тыя. Нейкая яна надта шэрая пасля Кракава.

У Варшаве мы з кіроўцам развіталіся і я пачаў стопіць на аўтобусным прыпынку, аднак беспаспяхова. Каб не замёрзнуць, я пайшоў наперад, балазе алея была добра асветлена. Ішоў кіламетры чатыры, уздоўж дарогі – катэджы, шыкоўны гатэль. Колькі, цікава, тут каштуе нумар? Але наперадзе паказалася скрыжаванне. Так як далей ісці сэнсу не было, то я спыніўся тут. У крайнім выпадку можна пераначаваць тут, а ранкам працягнуць стопіць альбо вярнуцца ў Варшаву. Але тут, як у казцы, з-за паварота паказаліся дзве фуры. Мая рука з вялікім пальцам ускінулася, напэўна, аўтаматычна. А сам думаю: "Яны і ўдзень не надта хочуць спыняцца, а тут ноч". Аднак адбыўся цуд – апошняя фура спынілася, і… ура – я еду ў Кракаў!!!

Кіроўца аказаўся цудоўным чалавекам, спытаў у мяне хто я і адкуль. Моцна здзівіўся, даведаўшыся што я беларус. Распавёў мне пра Кракаў, пра сваю сям'ю. Сказаў, што зараз едзе з Варшавы і, наогул, у асноўным ездзіць па Польшчы. Пачаставаў півам, даў паесці, карацей кажучы – клас. А за акном – дарога, якая быццам гірлянда адбіваецца ў святле катафотаў. Я сяджу ў цяпле, п'ю піва і павольна еду ў Кракаў. Хутка пачаўся моцны дождж, і заставалася толькі меркаваць, што чакала б мяне, калі б я не злавіў машыну. Незаўважна я заснуў, а прачнуўся акурат тады, калі мы пад'язджалі да горада, а дакладней, спускаліся з халма. Так што ўвесь горад быў як на далоні, у прамянях узыходзячага сонца ўсё гэта было чымсьці казачным, нерэальным, быццам не са мной!

**(Заканчэнне падарожжа – у наступным нумары «Дзедзіча»)**

**Андрэй КІСЛЯКОЎ**

# РАЗМЕРКАВАННЕ

## ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ

**СЁННЯ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ (АСАБЛІВА СТАРЭЙШЫХ КУРСАЎ) ВЕЛЬМІ АКТУАЛЬНАЙ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ПРАБЛЕМА РАЗМЕРКАВАННЯ НА ПРАЦУ. КАБ ДАПАМАГЧЫ РАЗАБРАЦЦА ВА ЎСІХ ХІТРЫКАХ ГЭТАГА СКЛАДАНАГА І, ДЗЯКУЮЧЫ СЁННЯШНІМ УЛАДАМ, ДАВОЛІ МУДРАГЕЛІСТАГА ПРАЦЭСУ, МЫ ВЫРАШЫЛІ ПРААНАЛІЗАВАЦЬ ПАЛАЖЭННЕ АБ РАЗМЕРКАВАННІ ВЫПУСКНІКОЎ, ЗАЦВЕРДЖАНАЕ ПАСТАНОВАЙ № 1679 САВЕТА МІНІСТРАЎ РБ 24 СНЕЖНЯ 2003 Г. РАІМ УВАЖЛІВА ПРАЧЫТАЦЬ АДАПТАВАНЫ ДЛЯ ЗВЫЧАЙНАГА ЧАЛАВЕКА ТЭКСТ ПАЛАЖЭННЯ, КАБ ВЕДАЦЬ І АДСТОЙВАЦЬ СВАЕ ПРАВЫ.**


Фота: ByMedia.net

Палажэнне прадугледжвае парадак размеркавання выпускнікоў, якія вучацца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў.

Выпускнік, які закончыў поўны курс навучання і накіраваны на працу камісіяй па персанальным размеркаванні, лічыцца адпаведна маладым спецыялістам і абавязаны адпрацаваць па накіраванні на працу 2 гады з дня заключэння працоўнага дагавору паміж ім і наймальнікам.

Час службы ва Узброеных Сілах РБ пасля заканчэння ўстановы адукацыі залічваецца ў тэрмін абавязковай працы маладога спецыяліста па накіраванню.

### ПАРАДАК РАЗМЕРКАВАННЯ

Размеркаванне выпускнікоў праводзіцца камісіяй па персанальным размеркаванні не пазней чым за два месяцы да заканчэння ўстаноў адукацыі.

Выпускнікі размяркоўваюцца на працу згодна з заяўкамі арганізацый, адпаведных міністэрстваў і іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, дагаворамі аб падрыхтоўцы спецыялістаў.

Парадак працы камісій, чарговасць размеркавання выпускнікоў вызначаецца ўстановай адукацыі.

Камісія знаёміцца з дадзенымі выпускніка: вынікамі паспяховасці, дакументамі аб стане здароўя, удзеле ў навукова-даследчай, грамадскай рабоце, заслухоўвае і абмяркоўвае рэкамендацыі ўстановы адукацыі аб найбольш мэтазгодным накіраванні яго на працу, асабістыя пажаданні выпускніка аб яго будучай працы, улічвае сямейнае становішча.

Працу выпускніку ад імя камісіі прапаноўвае яе старшыня. Рашэнне аб накіраванні на працу прымаецца, як правіла, у прысутнасці выпускніка. Калі выпускнік не з'явіўся на пасяджэнне камісіі, рашэнне прымаецца ў яго адсутнасць. Пры размеркаванні могуць улічвацца раней выказаныя пажаданні выпускніка.

Выпускнікам, якія маюць інваліднасць першай ці другой групы праца прадастаўляецца з улікам стану іх здароўя па месцы пастаяннага жыхарства бацькоў, мужа (жонкі) або з іх згоды ў адно з наяўных месцаў працаўладкавання.

Выпускнікам, якія маюць аднаго з бацькоў ці мужа (жонку) інваліда І ці ІІ групы, праца прадастаўляецца з улікам іх просьбы, па магчымасці, па месцы пастаяннага жыхарства бацькоў, мужа (жонкі).

Мужу і жонцы, якія заканчваюць установу адукацыі аднačасова, праца прадастаўляецца ў арганізацыях, размешчаных у адным населеным пункце. Калі адзін з выпускнікоў – муж (жонка) размеркаваны раней, то другому выпускніку – жонцы (мужу) праца, па магчымасці, прадастаўляецца ў тым жа населеным пункце.

Выпускнікам - цяжарным жанчынам, маці ці бацьку, якія маюць дзіця ва ўзросце да 3 гадоў, праца прадастаўляецца па іх просьбе па месцы пастаяннага жыхарства сям'і.

Калі камісія не можа прадаставіць працу выпускніку ў сувязі з адсутнасцю месцаў працаўладкавання па атрыманай спецыяльнасці, яму прадастаўляецца магчымасць самастойнага працаўладкавання з выдачай даведкі аб самастойным працаўладкаванні.

### ГАРАНТЫІ І КАМПЕНСАЦЫІ

Міністэрствы, іншыя рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, кіраўнікі арганізацый абавязаны забяспечыць для маладых спецыялістаў неабходныя жыллёвыя і бытавыя ўмовы.

Выпускнікам, якія атрымалі накіраванне на працу, па заканчэнні ўстановы адукацыі даецца адпачынак працягласцю ў адзін месяц незалежна ад таго, калі яны мелі апошнія канікулы.

Выпускнікам устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, выплочваецца грашовая дапамога ў памеры месячнай стыпендыі, атрыманай у апошнім семестры, за кошт сродкаў арганізацый, у якія выпускнікі накіраваны на працу.

Выпускнікам педагагічных спецыяльнасцей выплочваецца грашовая дапамога з разліку месячнай стыпенды, якую яны атрымалі ў апошнім перад выпускам семестры за 45 каляндарных дзён за кошт бюджэтных сродкаў.

У тых выпадках, калі выпускнік не атрымліваў стыпендыі ў апошнім перад выпускам семестры, адпаведная грашовая дапамога яму выплочваецца, зыходзячы з разліку сацыяльнай стыпендыі.

Выпускнікам устаноў адукацыі, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, за час адпачынку акрамя стыпендыі выплочваецца грашовая кампенсацыя за харчаванне, зыходзячы з устаноўленых норм.

Акрамя названага выпускнікам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, пасля заканчэння ўстановы адукацыі выдаецца вопратка, мяккі інвентар, абсталяванне і грашовая дапамога ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Выпускнікам устаноў адукацыі, якія атрымалі магчымасць самастойнага працаўладкавання, грашовая дапамога не выплачваецца.

Выпускнікам, накіраваным пасля заканчэння ўстановы адукацыі на працу ў іншую мясцовасць, гарантуюцца выплаты, прадугледжаныя заканадаўствам.

Маладым спецыялістам, якія прыбылі на працу па персанальным размеркаванні, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, а таксама арганізацыі пры недастатковасці ўласнага жыллёвага фонду могуць выдзяляць сродкі з мэтай кампенсацыі затрат на наём жыллёвых памяшканняў у грамадзян.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, а таксама арганізацыі могуць выдаваць маладым спецыялістам пазыкі на індывідуальнае будаўніцтва, набыццё мэблі і іншага бытавога і сельскагаспадарчага інвентару, прымаць без чаргі ў жыллёва-будаўнічыя кааператывы.

Наймальнікам, незалежна ад формы ўласнасці, забараняецца на працягу двух гадоў пасля заканчэння ўстановы адукацыі прымаць на працу выпускнікоў без пасведчання аб накіраванні на працу або даведкі аб самастойным працаўладкаванні.

Звальненне маладых спецыялістаў або перавод іх на працу, якая не звязана з атрыманай спецыяльнасцю, да заканчэння абавязковага тэрміну працы забараняецца, за выключэннем звальнення па ініцыятыве наймальніка за віноўныя дзеянні або ліквідацыі арганізацыі.

У выпадку невыканання парадку прыёму на працу выпускнікоў і звальнення маладых спецыялістаў, наймальнік вяртае сродкі, затрачаныя на навучанне выпускніка, у бюджэт. У выпадку адмовы ад добраахвотнага кампенсавання грашовых сродкаў за навучанне іх спагнанне ажыццяўляецца ў судовым парадку.

Маладыя спецыялісты, якія працуюць па размеркаванні, могуць быць (з іх згоды) звольнены ў парадку пераводу да другога наймальніка, а таксама па абставінах, незалежных ад волі бакоў.

На маладых спецыялістаў, якія накіраваны на працу ў арганізацыі, што размешчаны ў зонах радыяцыйнага забруджання, распаўсюджваюцца ільготы і кампенсацыі згодна з заканадаўствам.

**P.S. Напрыканцы адзначым, што кіраўнікі ўстаноў адукацыі абавязаны да пачатку працы камісіі арганізаваць работу па азнаямленні выпускнікоў з Палажэннем аб размеркаванні, месцамі і планамі размеркавання, дагаворамі аб падрыхтоўцы спецыялістаў, заяўкамі на спецыялістаў, з парадкам працы камісій. Хаця практыка паказвае, што ўстановы адукацыі падыходзяць да гэтага свайго абавязку, мякка кажучы, фармальна. Гэта і зразумела: чым менш чалавек ведае, тым прасцей яго ... (самі ведаеце што).**

**Алена ДЗЕМІДЗЮК**

## ДАРЭЧЫ

Чацвёра едуць у купэ. Трое травяць палітычныя показкі, а чацвёрты маўчыць. Нарэшце ён не вытрымаў і кажа:

– Вось вы жартуеце, а ў разетку генерал КДБ падслухоўвае.

Яго паднялі на смех. Тады ён нахіляецца да разеткі і кажа:

– Чатыры шклянкі гарбаты, калі ласка.

Адчыняюцца дзверы, уваходзіць праваднік з гарбатаю. Усе абалдзелі, ну ды рабіць няма чаго – папілі гарбаты і паляглі спаць.

Раніцай мужык прачынаецца – больш у купэ нікога няма. Кліча праваднiка:

– С-с-скажыце, а дзе тыя, што са мной ехалі?

– Ды, генерал КДБ тут быў, усіх забраў. Хацеў і вас узяць, ды ўжо вельмі яму ваш жарт з гарбатай спадабаўся.

***

Вып'ем за тое, каб у адной руцэ ў нас заўсёды быў келіх віна, а другой мы маглі даць па фізіяноміі кожнаму, хто паспрабуе яго адабраць!

***

У чым розніца паміж наркаманамі і энергетыкамі? У наркаманаў усе адключэнні – толькі планавыя.

***

Калі ў вас пачалі расці рогі – не спяшайцеся абвінавачваць жонку! Магчыма, вы проста казёл.

***

Падыходзіць мужык да чаргі і пытае:

– Хто апошні?

Яму адказваюць:

– Ты.

***

Чабурашка:

– Гена, давай я вазьму торбы – а ты возьмеш мяне.

Гена:

– Угаварыў, вычварэнец!

***

– Добры дзень, Уладзімір Мікалаевіч. Мы сёння з Вашай дачкой гуляць ідзём, можа, і Вам заадно што-небудзь у аптэцы набыць?

***

Малады адвакат выступаў у судзе па справе аднаго фермера, які падаў зыск супраць чыгуначнай кампаніі за тое, што цягнік раздавіў яго дваццаць чатыры свінні.

Імкнучыся зрабіць уражанне на прысяжных памерам нанесенай шкоды, адвакат заявіў:

– Дваццаць чатыры свінні, спадарства! У два разы больш, чым вас!

***

Афіцэр у свайго сябра-цывільнага пытае:

– Праўда, што вы, цывільныя, усіх ваенных тупымі лічыце?

Той:

– Ды не, што ты.

– А калі шчыра? Я не пакрыўджуся.

– Ну, калі шчыра, то лічым.

– Вось так, значыць, – гаворыць афіцэр, – але калі вы ўсе такія разумныя, чаго ж вы строем-та не ходзіце?

– Як справы ў Каляна?

– Папаўся ён на хабары – 5 гадоў далі...

– Ды ты што?! Толькі ж па-чалавечаму жыць пачаў!

– Так, дзіцяці 2 гады!

– А дзіцяці-та за што?!

***

Прапануем пральныя машыны, створаныя расейскімі абароннымі прадпрыемствамі пасля канверсіі!

У канструкцыі выкарыстаны найноўшыя ваенныя тэхналогіі: пасля мыцця бялізна сама падае і 50 разоў аджымаецца.

***

Беларускія вучоныя вынайшлі ўнікальны апарат, які пры родах тэлепартуе боль ад маці да бацькі. Вырашылі праверыць, падключылі да парадзіхі, уключылі на 50% магутнасці. Жонка пачала раджаць. Тэлефануюць бацьку і пытаюць:

– Прабачце, Вы што-небудзь адчуваеце?

– Я нічога не адчуваю, ФУТБОЛ ідзе!!! – кажа бацька і кладзе слухаўку. Дзіўна! Вучоныя ўключылі апарат на 75% магутнасці, ізноў тэлефануюць:

– Выбачайце, калі ласка, Вы што-небудзь адчуваеце?

– Я нічога не адчуваю, тут ФУТБОЛ ідзе, не турбуйце мяне!!!

Збянтэжаныя вучоныя ўключаюць апарат на 100%. Жанчыне зусім не баліць, адпачывае. Звоняць мужу:

– Ну, а зараз вы што-небудзь адчуваеце?

– Блін! Тут нашыя, казлы, прайграюць!!! Сусед, мудак, за сценкай крычыць!!! І яшчэ гэтыя ідыёты тэлефануюць!!!

***

Прадам тралейбус. Поўны электрапакет.

***

Жанчына прыходзіць у аптэку і пытае ў фармацэўта:

– Скажыце, у вас ёсць мыш'як?

– Прабачце, а навошта ён вам патрэбен?

– Мужа атруціць хачу!

– У такім выпадку я не магу вам яго прадаць.

Тады жанчына дастае з сумачкі фотаздымак, на якім яе муж у вельмі цікавай сітуацыі зняты разам з жонкай таго самага фармацэўта! Зірнуўшы на фотку, фармацэўт кажа:

– А, ну калі ў вас ёсць рэцэпт!

***

1 красавіка – Дзень барацьбы са спамам.

У гэты дзень прынята тэлефанаваць па тэлефонах са спамаўскіх рассылак і мацернымі словамі дзякаваць усім за цікавыя лісты.

***

У сярэднявечнай Беларусі эпідэмія халеры. Адзін мясцовы жыхар бачыць, як нейкі незнаёмы падыйшоў да крыніцы са шклянкай з яўным намерам напіцца.

Беларус крычыць яму:

– Не пі адтуль – тут халера, заразішся!

Незнаёмы паварочвае і перапытвае:

– Чего говоришь?

Беларус адказвае:

– Я говорю, дорогой – пей медленно: вода очень холодная, горло простудишь...

Словы, якія ЦЯЖКА вымавіць у п'яным стане:

Сацыялогія

Лапландыя

Прафесіянал

Заплатка.

Словы, якія ВЕЛЬМІ ЦЯЖКА вымавіць у п'яным стане:

Гібралтар

Нераспаўсюджванне

Джасперызацыя

Самакіраванне

Трабекулатамія.

Словы, якія НЕМАГЧЫМА вымавіць у п'яным стане:

Не, не распранайся – ты мне не падабаешся.

Добры вечар, таварыш сержант, як я рады, што вы мяне спынілі.

Не, не буду спяваць – усё роўна ніхто мяне не слухае!

Не, мне больш не налівайце!

***

У студэнта 2 святы. Гэта Новы год і Кожны дзень.

***

Дзеці на заднім сядзенні аўтамабіля з'яўляюцца крыніцай інцыдэнтаў.

Інцыдэнты на заднім сядзенні аўтамабіля з'яўляюцца крыніцай дзяцей.

***

– Прабачце, спадарыня, вы часам не ведаеце, што ядуць на сняданак цнатлівыя дзяўчыны?

– Не, не ведаю.

– Я так і падумаў!

***

У купэ цягніка сядзяць немец, амерыканец, кітаец і турак. Сядзяць, маўчаць. Кожнага распірае жаданне паказаць сваю перавагу перад іншымі.

Кітаец устае, падыходзіць да акна, выцягвае з торбы пакет з рысам і выкідае ў фортку са словамі:

– У нас гэтага дабра завались!

Тут жа падыходзіць да акна амерыканец і выкідае пачак даляраў:

– У нас гэтага дабра завались!

Пасля гэтага турак падсаджваецца да немца і шапоча яму на вуха:

– Толькі без глупстваў!

***

Едзе ізраільская экскурсія па Нямеччыне, па месцах II Сусветнай вайны: канцлагеры, месцы бітваў і да т. п. Ламаецца ў іх аўтобус, і кіроўца-немец грукае ў суседні дом.

Адчыняе яму тыповы бюргер: у адной руцэ сасіска, у другой – цёмнае піва.

Кіроўца пытае:

- Ці не маглі б вы мне дапамагчы. Тут такая справа, вязу габрэяў ў канцлагер, а аўтобус зламаўся.

– Прабач, сябра, нічым не магу дапамагчы – у мяне нават мікрахвалеўкі няма.

***

– Вы любіце дзяцей? – пытае гаспадар маладую няню, якую наймае на працу.

– Безумоўна! Але я вам буду вельмі ўдзячная, калі вы будзеце перасцерагацца!

№2 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
сакавік 2005

ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ

Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

**Заснавальнік:** Ініцыятыўная група моладзі
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк:** 18.03.2005 у 18$^{00}$
**Наклад:** 299 асобнікаў. Надрукавана на ксераксе.

**Галоўны рэдактар:** Дзмітрый Шыманскі.
**Рэдакцыйная калегія:** А. Лена, М. Ікола, Д. Змітрый, М. Арыя, С. Яргей, С. Яржук, Ю. Рась.
**Адказны сакратар:** А. Ндрусь. **Вёрстка:** Б. Дэпеша

**Кантактны тэлефон:** (0162) 23-68-02, (029) 660-57-41, (029) 725-15-39
**E-mail:** dzedzich@dzedzich.org, інтэрнэт: www.dzedzich.org